ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



«Тое, што мяне пазнаюць і ведаюць, — факт. Але ніхто не стаіць пад маімі вокнамі з кветкамі і не крычыць: «Хачу нарадзіць ад цябе дзіця», дзякуй Богу, гэта таксама факт. Я такі чалавек, што ўвесь час шукаю прыгоды на сваю галаву».

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 кастрычніка 2012 г. ЧАЦВЕР № 207 (27322) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЛІЧБА ДНЯ

*3 млн 520,4 тысячы*

*рублёў склала намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені-верасні 2012 года, у тым ліку ў верасні — Br4 млн 96,7 тыс., павялічыўшыся ў параўнанні са жніўнем на 0,3 працэнта, або на Br11,8 тыс. Паводле аператыўных статыстычных даных, у верасні гэтага года ў прамысловасці сярэдняя заработная плата склала Br4 млн 617,1 тыс., у будаўніцтве — Br5 млн 46,6 тыс., у адукацыі — Br2 млн 899,9 тыс., у сельскай гаспадарцы. Заработная плата работнікаў аховы здароўя і прадастаўлення сацыяльных паслуг у верасні склалася ў памеры Br3 млн 214,6 тыс., у тым ліку ў галіне аховы здароўя — Br3 млн 302,5 тыс.*

■ Увага!

## У ПЯТНІЦУ — ПЕРШАЯ ЗАВІРУХА

**Сёння ўдзень у многіх раёнах Беларусі будзе ісці дождж, а па поўначы магчымы нават мокры снег, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Чакаецца, што месцамі ў Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях узмоцніцца вецер парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература ўдзень усяго 4—10 цяпла.

**Сінаптычнае папярэджанне аб рэзкім змяненні надвор'я перадаюць айчынныя спецыялісты на 26 кастрычніка.** У пятніцу на тэрыторыю Беларусі завітае сур'ёзны атлантычны цыклон. Паўсюдна будзе ісці дождж, які зменіцца мокрым снегам, а ў асобных раёнах Беларусі магчыма нават сапраўдная мяцеліца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +9° |
| Віцебск | +3° |
| Гомель | +6° |
| Гродна | +6° |
| Магілёў | +4° |
| Мінск | +4° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.10.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8490,00 ▼ |
| Еўра | 11010,00 ▼ |
| Рас. руб. | 271,00 ▼ |
| Укр. грыўня | 1040,31 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Нетры твае, Беларусь

# ЯК ШУКАЮЦЬ БЕЛАРУСКУЮ НАФТУ

## Яна адмываецца з твару тры дні і ні ў якім разе не павінна біць з зямлі фантанам



**Першую нафту на свідравіне «Шумяцiцкая-1» знайшлі глыбей за 4 кіламетры. Вядучы геолаг Мазырскай нафтаразведвальнай экспедыцыі Дзмітрый ЛІТОШЫК.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**...Пару гадзін шляху ва ўсходнім кірунку, глухія вёскі, а пасля ўвогуле — гразкія дарогі ў лесе. Нарэшце мы на месцы: астравок з рабочых баракаў і вышка пасярэдзіне. Недзе тут павінна быць нафта...**

**...На свідравіне «Шумяцiцкая-1», якая знаходзіцца ў Глускім раёне на Магілёўшчыне, прамысловая здабыча «чорнага золата» пакуль не вядзецца. Першую нафту тут знайшлі крыху глыбей за 4 кіламетры, але працу прадоўжылі, і цяпер на «Шумяцiцкай» нафтавікі «дакапаліся» да глыбіні ў 5101 метр.**

— Верагодней за ўсё, на гэтай свідравіне шэсць нафтаперспектыўных інтэрвалаў, пачынаючы з глыбіні 4240 да 4980 тысяч метраў, — расказаў намеснік генеральнага дырэктара па нафце і газу геолагаразведвальнага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белгеалогія» Яраслаў Грыбок. — У працэсе бурэння мы вызначылі, што нафта, магчыма, ёсць у фундаменце, на глыбіні 5020 метраў. Патлумачу, што гэта значыць. Звычайна, нафта залягае ў асадкавых пародах. Такіх, як даламіты, пясчанікі. А фундамент — гэта крышталічная парода, якая з арганічнага пункту гледжання не павінна змяшчаць нафту. У свеце маюцца нафтавыя радовішчы ў фундаменце (напрыклад, ва Украіне і В'етнаме), але для Беларусі гэта незвычайна.

Нас пускаюць за вароты, бліжэй да буравой вышкі, якая бесперапынна шуміць. Тут, у драўляных скрынках, ляжаць 400 мільёнаў гадоў гісторыі зямлі, да якіх можна дакрануцца: рознакаляровыя ўзоры пароды, праз якую трэба дакапвацца да нафты. Прыгадваюцца падручнікі па геаграфіі, дзе зямля, намаляваная ў разрэзе, нагадвае слаёны пірог з рознай начынкай. У нейкім сэнсе гэта сапраўды так...

...Тэмпература на той глыбіні, да якой дабраліся нафтавікі, — каля ста градусаў. І гэта далёка не самая вялікая складанасць, з якой сутыкаюцца, шукаючы нафту так глыбока. Аказваецца, на тое, каб спусціць абсталяванне ў свідравіну, адбурыць 20-30 гадзін, а пасля падняць буравы інструмент (трубы, якія накручваюцца адна на адну і спускаюцца ў нетры зямлі), патрабуюцца цэлыя суткі. Цікаўлюся, ці не занадта дарагой атрымліваецца нафта, знойдзеная так глыбока?

СТАР. 2

■ Анонс

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ!

**25 кастрычніка з 14 да 16 гадзін намеснік начальніка па эксплуатацыі вытворчасці «Мінская пошта» Алена Уладзіміраўна ПРАКАПЕНЯ** адкажа на пытанні функцыянавання аддзяленняў паштовай сувязі Мінска, а таксама раскажа аб альтэрнатыўных магчымасцях атрымання паслуг па-за аперацыйнымі вокнамі аддзяленняў паштовай сувязі.

Задаць свае пытанне можна па тэлефоне **8 (017) 293 59 48.**

## З ЛІСТАПАДА ПАВЫШАЮЦЦА ПАМЕРЫ ПРАЦОЎНЫХ ПЕНСІЙ

**Аб гэтым паведаміў БЕЛТА намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.**

Адначасова з пераразлікам працоўных пенсій, заснаваным на росце сярэдняй заработнай платы, у лістападзе будуць пералічаны мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, надбаўкі, павышэнні да пенсій і даплаты да пенсій асоб старэйшых узростаў у сувязі з ростам бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (БПМ), дадаў намеснік міністра.

Паводле ацэнкі, БПМ у цэнах верасня 2012 года ў параўнанні з яго папярэднім пакачыкам вырасце на 4,3 працэнта і складзе Br880 тыс. 30. Адпаведна на 4,3 працэнта павялічацца сацыяльныя пенсіі, надбаўкі, павышэнні і даплаты да пенсій. У выніку пераразлікаў пенсій у лістападзе сярэдняя пенсія па ўзросце павялічыцца на 14,1 працэнта і складзе Br1 млн 964,3 тыс.

■ Занятасць

## ПА ВАКАНСІІ — НА КІРМАШ

**Мінскі Палац культуры чыгуначнікаў ператварыўся ў сераду на тры гадзіны ў гіганцкую біржу працы. У чарговы раз там прайшоў сталічны кірмаш вакансій.**

Яго арганізатарам стаў Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. Больш за дзевяноста наймальнікаў шукалі для сябе работнікаў. Працу можна знайсці на прадпрыемствах рознага кшталту — ад заводаў да сетак магазінаў. Завіталі туды і карэспандэнты «Звязды».

— Я шукаю сабе працу, якая не патрабуе спецыяльнай адукацыі, — гаворыць Алеся. — Я вучуся на другім курсе ўніверсітэта.

СТАР. 2

■ Дата

## «АБЕРНЕМ У СВЯТА МЫ ДЗЕНЬ НАШ БУДНЫ»

**Якуба Коласа ўслаўляць на яго радзіме**

**У гонар народнага паэта Беларусі 26 кастрычніка адбудзецца рэспубліканскае свята паэзіі «О, Беларусь, ты сэрца і душа». Свята гэта для Стаўбцоўшчыны вялікае, але ж значны і ўвесь юбілейны год, у які пастараліся аднавіць, падтрымаць, прывесці да ладу ўсё, што звязана з Якубам Коласам. А такіх месцаў у раёне шмат. Адных філіялаў мемарыяльнага музея Якуба Коласа — чатыры сядзібы.**

СТАР. 2

■ Наш фармат

## У ДЭЛЕГАТЫ НА «ЕЎРАБАЧАННЕ» ЗАПІСАЛІСЯ N.R.M. І АЛЕНА ЛАНСКАЯ

**Каля 60 выканаўцаў і калектываў жадаюць паспаборнічаць за права прадстаўляць Беларусь на «Еўрабачанні-2013».**

**Але гэта лічба не канчатковая — нягледзячы на тое, што апошнім днём прыёму заявак абыло абвешчана 22 кастрычніка, некаторыя каштоўныя бандэролі, датаваныя гэтым днём, могуць прыйсці да канца бягучага тыдня, і ўсе яны абавязкова будуць разгледжаныя. 75 выканаўцаў і калектываў жадаюць паспаборнічаць за права прадстаўляць Беларусь на «Еўрабачанні-2013».**

СТАР. 3

# ЯК ШУКАЮЦЬ БЕЛАРУСКУЮ НАФТУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Галоўны геолаг Мазырскай нафтаразведвальнай экспедыцыі глыбокага бурэння Аляксандр Сусленка лічыць, што нафта акупіць сябе ў любым выпадку.

— Выдаткі ідуць толькі на само бурэнне і зарплату для рабочых, — гаворыць Аляксандр Лукіч. — Абсталяваннем можна карыстацца не адзін раз, перавезці пасля на новы аб'ект. У нас яно звычайна служыць 15-20 гадоў. Умоўна, калі свідравіна каштуе мільён долараў, акупіць яна сябе праз год-два. Увогуле, галоўная цяжкасць для нас — не асвоіць радовішча, а менавіта знайсці месца, дзе можа быць нафта.

Па словах нафтавікоў, той прыток, які ўжо ўдалося атрымаць на свідравіне, зусім не гаворыць пра тое, што тут будзе радовішча. Каб гэта пацвердзіць, патрэбна здабыць прамысловы прыток і вывесці пэўную колькасць нафты на паверхню.

— У Беларусі на Рэчыцкім радовішчы былі свідравіны, якія давалі па 1000 «кубоў» нафты за суткі. Аб'ём запасаў там ацэньваўся ў 30 мільёнаў тон, — расказаў Аляксандр Сусленка. — Тут, зразумела, такога маштабу чакаць не выпадае. Пакуль прыток на «Шумяцiцкай» ацэньваецца ў 20 метраў кубічных за суткі. А пра аб'ём запасаў увогуле казаць яшчэ рана...

...Палявы «гарадок» нафтавікоў здзівіў месцам, якое выглядала яшчэ больш загадкава і незразумела, чым буравая вышка з безліччу прыстасаванняў. У збудаванні з рознымі прыборамі, графікамі, падобнымі да кардыяграм, кнопкамі, прыстасаваннямі, да якіх простаму чалавеку боязна дакрануцца, каб чаго не сапсаваць, нас сустрэў геафізік Анатоль Зялёненькі. Як толькі мы апынуліся ў пакоі з усімі гэтымі прыборамі і графікамі, нам пачалі тлумачыць нешта пра кантроль вуглевадародных газаў у буравым растворы. Выходзіць, трапілі мы ў "сэрца пошуку" нафты: падчас бурэння прыборы аналізуюць, якія газы ёсць у растворы на гэты момант. Калі тлумачыць ужо зусім папростаму, пэўная канцэнтрацыя пэўнага рэчыва гаворыць пра наяўнасць нафты.

Дарэчы, «прааналізаваць» буравы раствор у нейкім сэнсе давялося ўласнаручна. Ужо на іншай свідравіне, «Нова-Бярэзінскай» у Жлобінскім раёне, журналістам дазволілі падняцца да буравой вышкі. На прыборы,



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Нова-Бярэзінская свідравіна ў Жлобінскім раёне.

падобным да сіта, прамывалі здробленую пароду. Раствор шэрага колеру з крупінкамі каменю аказаўся масляністым і густаватым.

— Нафта? — з надзеяй падымаю вочы на нашага праважатага.

— Не, гэта з-за буравога раствору, які робіцца на аснове гліны.

— А дзе ж нафта? Пакажуць нам сёння, як яна б'е фантанам? — пажартаваў нехта.

Як аказалася, фантан паглядзець не атрымаецца таму, што гэта будзе лічыцца аварыяй. Калі здарыцца, што нафта пойдзе з зямлі, «фантан» супакоюць спецыяльныя прыстасаванні, якія здольны вытрымаць такі ціск. А яшчэ, як вядома, адзенне і скуру пасля адмыць праблематычна.

— Калі мяне пасвячалі ў нафтавікі, па традыцыі выпацкалі нафтай твар, рукі... Пасля адмываў нафту дні тры, не менш, — расказаў адзін са спецыялістаў, што працавалі на свідравіне...

Колькі здабудуць нафты з «Нова-Бярэзінскай», таксама пакуль сказаць нельга. Па правілах геалогіі, забраць з радовішча можна толькі 40 працэнтаў чорнай маслянітай вадкасці, якая на сённяшні дзень — адзін з самых дарагіх у свеце тавараў.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

*Глускі раён - Жлобінскі раён.*

# ПА ВАКАНСІІ — НА КІРМАШ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З-за раскладу заняткаў магу разлічваць на працу выключна ў вячэрні час. Вельмі патрэбны грошы, бо не хачу сядзець на шыі ў бацькоў. Ці хаця б кампенсую частку выдаткаў на адукацыю, таму што вучуся на платным аддзяленні. Добра, што шматлікія працадаўцы сёння знаходзяцца ў адным памяшканні: можна на месцы распытаць пра ўсе асаблівасці і патрабаванні. І, зразумела, ёсць з чаго выбраць!

Прадпрыемства «Мінскдрэў», «Рамаўтадар» Партызанскага раёна, Мінскі завод колавых цягачоў, ЖРЭА Партызанскага раёна, Мінскі маргарынавы завод, філіялы прадпрыемства «Мінсктранс», арганізацыі са сферы гандлю, грамадскага харчавання... Ад колькасці прадпрыемстваў, дзе патрабуюцца супрацоўнікі, разбягаюцца вочы.

— Толькі на гэтым кірмашы прадстаўлена каля пяці тысяч вакансій. Патрабуюцца спецыялісты розных профіляў — слесары, ахоўнікі, прадаўцы, наладчыкі абсталявання, касіры, грузчыкі, трактарысты, токары, вадзіцелі, кандуктары... Але перавага на баку прамысловасці і будаўніцтва, бо там недахоп высокакваліфікаваных работнікаў адчуваецца выразней, — паведаміла **галоўны спецыяліст аддзела арганізацыі працы па садзейнічанні занятасці насельніцтва Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Вікторыя УСОВІЧ.** — Калі наведнік кірмашу ўсур'ёз зацікавіўся прапанаванай магчымасцю ўладкавацца на працу, то ён адразу атрымае ад прадстаўнікоў аддзелаў кадраў усе неабходныя кансультацыі. Яны датычацца і графіка працы, і ўзроўню зарплаты, і сацыяльнага пакета, і культурна-бытавой сферы — словам, усяго, што можа прапанаваць арганізацыя.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сапраўдны ажыятаж узнік вакол сталоў, дзе знаходзіліся прадстаўнікі дзяржаўных транспартных арганізацый. Напрыклад, філіялы «Мінсктранса» прапаноўвалі шырачэзны спектр вакансій — ад кандуктараў і кіроўцаў да слесараў і наладчыкаў абсталявання.

— Толькі за першыя пяць хвілін працы кірмашу да нас запісаліся ўжо два чалавекі. Мы даём рэальны шанц знайсці працу. Слесар чацвёртага разраду альбо памочнік машыніста матавоза можа разлічваць на зарплату ад 3,5 мільёна рублёў. Прыкладна такія ж расцэнкі для астатніх рабочых спецыяльнасцяў. Для спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй лічбы большыя. Усё будзе залежаць ад аб'ёму выкананай работы, — сказала **начальнік аддзела кадраў Мінскага метрапалітэна Валянціна ШАРАМЕТ.**

Некаторыя арганізацыі нават гатовы навучыць будучых спецыялістаў асновам прафесіі. У асноўным гэта датычыцца сферы гандлю. Гэта добрая магчымасць лёгка знайсці працу, асабліва калі па розных прычынах не ўдалося ўладкавацца па спецыяльнасці. Цікава, што ў Мінску агульная колькасць вакансій амаль у 10 разоў большая за лічбу зарэгістраваных беспрацоўных і дасягае па стане на 1 кастрычніка амаль 24 тысяч. Таму шукайце сваё — і знойдзеце!

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# «АБЕРНЕМ У СВЯТА МЫ ДЗЕНЬ НАШ БУДНЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Праехаўшы па маляўнічых мясцінах, звязаных з жыццём Якуба Коласа, я магу сказаць, што мы маем вельмі цікавы турыстычны маршрут, які павінен быць уведзены ў плынь культурнага турызму, — гаворыць намеснік міністра культуры Беларусі Тадэвуш Стружэцкі. — Таму трэба выходзіць з прапановай да тураператараў на арганізацыю тураў у мясціны Коласа. Можа быць, мы вернемся да ідэі стварэння агульнага маршрута «Дарогамі Міцкевічаў», пачынаючы ад Адама Міцкевіча да Коласа. Але ўжо цяпер мы маем вельмі цікавы турыстычны маршрут па «Новай зямлі».

Ён з'явіўся дзякуючы працы музея і апантаным людзям, якія хацелі даказаць: словы паэта ажываюць, таму што яны жывыя. Таму што Коласам можна захапляцца не толькі тады, калі трэба яго вывучаць па праграме ці ў сувязі з датамі. Сярод такіх апантаных асоб — Анатоль Грэкаў, які ўзначальвае дабрачынны фонд Якуба Коласа. Па ініцыятыве фонду ў Смольні з'явіўся сквер «Дрэва жыцця», прысвечаны славутым асобам. І ўвесь час на коласаўскіх сядзібах з'яўляюцца нейкія цікавінкі — не дзеля справаздачы, а толькі дзеля таго, каб яшчэ раз нагадаць пра паэта.

Падчас рэспубліканскага свята паэзіі гэтым маршрутам можна не толькі праехаць — будзе магчымасць з ім пражыць колькі гадзін, адчуўшы дух радзімы Коласа, дзе ён не проста нарадзіўся, а дзе высветліў як паэт.

Напрыклад, у гэты дзень удзельнікаў свята пачнуць сустракаць яшчэ з той самай хаты, дзе Колас нарадзіўся — у Акінчыцах. Тут можна славіць настрой, якім прасякнута паэма «Новая зямля». А потым і сустрэцца з яе героямі: на маршруце, які ўмоўна называецца «Шлях Коласа». Усе героі паэмы нібыта паўстаюць у драўляных скульптурах. А радкі ў думках ажываюць, нават калі чытаў іх яшчэ ў школе, але ж яны самі ўсплываюць у памяці і суправаджаюць потым усю дарогу — да Альбуці і далей. «130 прысвячэнняў Коласу» — такі конкурс прапанаваў музей Якуба Коласа да юбілею Песняра. Фінал пройдзе падчас юбілейных імпрэз у Мінску, дзе аўтары лепшых прысвячэнняў будуць адзначаны. Як паведаміла дырэктар музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская, павінен убачыць свет зборнік прысвячэнняў. Але некаторыя з іх можна будзе паслухаць ужо на свяце — у Альбуці.

На сядзібах, звязаных з жыццём Коласа, можна будзе пазнаёміцца з творамі народных майстроў і паслухаць, як выступаюць народныя калектывы Стаўбцоўшчыны. І вершы — Якуба Коласа і сучасных беларускіх пісьменнікаў. У вёсцы Мікалаеўшчына а 14-й гадзіне ля помніка народнаму паэту Беларусі збяруцца людзі, каб ускласці кветкі. Дарэчы, на сайце школы Мікалаеўшчыны з'явіўся віртуальны школьны музей Коласа, паводле слоў намесніка старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама Сяргея Шэсцеля. Потым свята прыйдзе ў Стары Свержань, дзе ў Цэнтры культуры сучасныя чытачы змогуць сустрэцца з сучаснымі пісьменнікамі, ды паслухаць радкі і песні на вечарыне, дзе важна сказаць галоўнае — «Слова пра Коласа».

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### MOODY'S ЗАХАВАЛА НЕГАТЫЎНЫ ПРАГНОЗ БАНКАЎСКАГА СЕКТАРА КРАІН БАЛТЫІ

Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Moody's пацвердзіла негатыўны прагноз банкаўскага сектара краін Балтыі, паведамляюць інфармагенцтвы. Аналітыкі агенцтва прагназуюць далейшае пагаршэнне якасці актываў у сувязі з вялікай доляй праблемных крэдытаў. Яшчэ адной прычынай негатыўнага прагнозу агенцтва называе залежнасць буйных банкаў ад фінансавання мацярынскімі структурамі, а больш дробных банкаў — ад укладаў. Эксперты падкрэсліваюць, што на сітуацыю ў банкаўскім сектары краін Балтыі істотны ўплыў таксама аказваюць запаволенне росту ВУП, высокі ўзровень беспрацоўя, значныя даўгі грамадзян, якія скоўваюць унутранае спажыванне.

### У БЕРМУДСКІМ ТРОХВУГОЛЬНІКУ ЗНАЙШЛІ ПАТАНУЛЫ ГОРАД «ПРАСУНУТАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ»

Канадскія навукоўцы знайшлі падводны горад у Бермудскім трохвугольніку: даследчыкі паведамілі, што разгледзелі на здымках дна акіяна 4 піраміды, адна з якіх зроблена са шкла. Архітэктура нагадала канадцам культуру старажытнай лацінаамерыканскай «прасунутай», па іх вызначэнні, цывілізацыі Цеаціуакан дакласічнага перыяду гісторыі Цэнтральнай Амерыкі і Карыбскага басейна. Каманда навукоўцаў пад кіраўніцтвам Пола Вайнцвейга і Паліны Заліцкі даследавалі марское дно з дапамогай робата, які засняў руіны горада на дне мора ў 700 метрах на поўнач ад усходняга берага Кубы, перадае агенцтва Prensa Latina.

На кадрах, якія атрымалі даследчыкі, відаць не толькі піраміды, але таксама сфінкс і некалькі маналітных пабудоў, а на сценах будынкаў — выгравіраваныя надпісы, перадае Peru Punto com.

### ГРЭЦЫІ ДАЛІ НА СТАБІЛІЗАЦЫЮ ЭКАНОМІКІ ЯШЧЭ ДВА ГАДЫ

Міжнародныя крэдыторы пагадзіліся даць Грэцыі яшчэ два гады на стабілізацыю бюджэту, а таксама выдзеліць транш фінансавай дапамогі ў 31,5 мільярда еўра. Пра гэта паведамляе нямецкая газета Sueddeutsche Zeitung са спасылкай на неапублікаваныя дакументы. Згодна з рашэннем «тройкі», Афіны павінны будуць прывесці дэфіцыт дзяржаўнай казны да ўзроўню ў 3% ВУП да 2016 года, а не да 2014-га, як планавалася раней. Дадатковыя два гады патрэбныя Грэцыі, каб правесці рэформу рынку працы і энергетычнай галіны.

### ЧЫПСЫ Ў РАЦЫЁНЕ МАЦІ ПАМЯНШАЮЦЬ ВАГУ НОВАНАРОДЖАНЫХ

Калі жанчына есць падчас цяжарнасці чыпсы, у яе дзіцяці могуць узнікнуць сур'ёзныя праблемы. Было даказана, што любоў да гэтага прадукту, як і да пячэння, прыводзіла да нараджэння дзяцей з недастатковай масай цела, піша The Telegraph са спасылкай на абследаванне 1100 жанчын.

Уся справа ў акрыламідзе, які таксама ёсць у каве і хлебе. Акрыламід выпрацоўваецца падчас тэрмічнай апрацоўкі крухмалістых прадуктаў. Менавіта з-за яго ў дзяцей фіксаваўся яшчэ і паменшаны аб'ём галавы на 0,33 сантыметра. А гэты паказчык звязаны з адставаннем у развіцці.

Навукоўцы падкрэсліваюць: нізкая маса цела ў нованароджаных звязана з павышанай рызыкай з'яўлення сардэчна-сасудзістых хвароб, дыябету 2-га тыпу і астэапарозу.

### Гімнастка з Беларусі зламала шыю ў час выступлення ў Маскве

Вядомая гімнастка ўраджэнка Беларусі Таццяна Тур атрымала вельмі цяжкія траўмы ў час выступлення ў маскоўскім Цэнтры цыркавога мастацтва, паведамляюць інфармагенцтвы.

Выконваючы сальта, Таццяна Тур упала на галаву і зламала некалькі шыйных пазванкоў. Цяпер яна знаходзіцца ў рэанімацыі. Паводле слоў урачоў, атрыманыя траўмы вельмі цяжкія. За некалькі дзён да трагедыі гімнастка выйшла замуж.

### Гарэлка зноў падаражэла

З сённяшняга дня павысіліся гранічныя мінімальныя цэны на алкагольную прадукцыю (мацункам вышэй за 28%) — рознічная цана на паўлітровую бутэльку 40-градуснай гарэлкі з улікам ПДВ і кошту бутэлькі не можа быць ніжэй за 29600 рублёў, а на імпартныя алкагольныя напоі (без ПДВ) — не ніжэй за 43 тысячы рублёў. Вытворцы і імпарцёры алкагольнай прадукцыі, а таксама гандлёвыя арганізацыі не маюць права рэалізоўваць алкагольную прадукцыю танней, чым гэтыя цэны.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

**Считать недействительными** страховые полисы ФСООО «Белкоопстрах»: по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 0224725-0224727, 0224742, 0224746, 0224723, 0301665-0301666, 0337287, 0390456, 0401541, 0401553, 0401562, 0401569, 0401574, 0401590, 0410843, 0420766, 0423430, 0423651, 0424670, 0425082, 0436854, 0436855-0436856, 0451714, 0451777, 0465387, 0484229, 0484340; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств за пределами РБ серии BY/12/ № 4770240-4770241. УНП 100706519

## У ДЭЛЕГАТЫ НА «ЕЎРАБАЧАННЕ» ЗАПІСАЛІСЯ N.R.M. І АЛЕНА ЛАНСКАЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сярод ужо заяўленых ахвотнікаў ёсць добра знаёмыя слухачам імёны, як адроджаны наноў калектыў «Atlantica», леташні фіналіст адбору Юзары (ён даслаў дзве заяўкі — як выканаўца і аўтар песні для іншага артыста), самы першы беларускі канкурсант дуэт «Аляксандра і Канстанцін», Макс Лорэнс ці заўсёднік апошніх год гурт «Aura». Нечакана для большасці прыхільнікаў скочыў у апошні вагон гурт N.R.M. на чале з Пітам Паўлавым, менавіта 22 кастрычніка адправіўшы на конкурс стылізаваную этна-кампазіцыю «Кузнічка». Таксама ў апошні момант паведаміла аб сваім удзеле ў конкурсе і адна з леташніх фаварытак адбору Алена Ланская, аб чым, зрэшты, пільныя прыхільнікі лёгка маглі здагадацца яшчэ тыдзень таму, калі ў сацыяльных сетках распачаўся надзвычай актыўны піяр новай песні артысткі. Ветэран і неаднаразовы фіналіст нацыянальных адбораў спявачка Гюнэш, наадварот, загадзя падкрэсліла, што для сябе гэты конкурс закрыла — што таксама не дзіўна, улічваючы актыўную падрыхтоўку дзяўчыны да будучага вяселля. Ёсць у шэрагах прэтэндэнтаў і іншыя сюрпрызы рознай ступені нечаканасці, але да канца праслухоўвання — 31 кастрычніка — аб іх казаць пакуль што ранавата.

Затое самы час паведаміць, хто будзе сёлета «журыць» нацыянальны адбор. У судзейскую калегію ўвайшлі 17 чалавек — кампазітары, прадзюсары, прадстаўнікі тэле- і кіноіндустрыі, сярод якіх, напрыклад, старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька (старшыня журы), першыні кіраўнік канала БелМузТБ Сяргей Кухто, адказны за самае першае для Беларусі «Еўрабачанне» Уладзімір Максімкаў, галоўны рэжысёр Белдзяржцырку Сяргей Бандарчук, народныя артысты Беларусі Анатоль Ярмоленка і Аляксандр Ціхановіч, кінарэжысёр Аляксандр Яфрэмаў, кампазітар і музыкант Уладзімір Угольнік, загадчык кафедры духавой музыкі БДУК Віктар Валаткевіч ды іншыя. Да сярэдзіны лістапада журы мусіць вызначыць да 15 удзельнікаў паўфіналу адбору, а на 7 снежня прызначаны фінальны канцэрт, падчас якога суддзі і тэлегледачы сумесна абяруць пераможцу нацыянальнага адбору — прадстаўніка Беларусі на «Еўрабачанні-2013» у Швецыі, і двух яго дублёраў — на ўсякі выпадак.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■

# ІСПАНСКАЯ ПАСТКА

**БАТЭ пацярпеў першае паражэнне ў сёлетнім розыгрышы Лігі чэмпіёнаў**



Падобная навіна і сапраўды цяпер успрымаецца з асаблівым эмацыйным адценнем. Зусім нядаўна ў лігачэмпіёнскай скарбонцы гульцоў Віктара Ганчарэнкі былі толькі нічыі, але новы еўракубкавы сезон паказаў Еўропе новы БАТЭ. Каманду, якая можа не проста ўдала гуляць супраць лідараў, але і нахабна іх перамагаць. Мюнхенскія заўзятары яшчэ добра памятаюць мінскі шок, калі невядомыя беларусы тройчы за матч адправілі ў накдаўн «зорак» «Баварыі». Аднак цяпер пра небяспечныя магчымасці БАТЭ ведае ўся футбольная Еўропа. І не дзіўна, што «Валенсія», адзін з грандаў найноўшага іспанскага футбола, падрыхтавалася да матча на «Дынама» сур'ёзна, адказна, без анiякай фанабэрыі. З беларусамі сапраўды ўжо лічацца, іх асцерагаюцца.

— Мы ведалі, што «Баварыя» саступіла БАТЭ з вялікім працэнтам валодання мячом. Тут галоўнае не проста трымаць мяч, галоўнае — не згубіць яго, — адказвае на пытанне карэспандэнта «Звязды» Раберта Сальдада, форвард «Валенсіі», якому было наканавана стаць хэдлайнерам футбольнага вечара.

Як і супраць мюнхенцаў, з «Валенсіяй» на «Дынама» беларусы таксама гулялі няблага. Мелі цудоўныя магчымасці, каб вызначыцца, напружвалі бразільскага галкіпера «аранжавых», але фартуна гэтым асеннім вечарам, напэўна, адпачывала ў цёплай кавярні. Беларусам крыху не шанцавала, а вось каманда Маўрысіа Пелегрына сваім шчасцем скарысталася. «Валенсія» проста не даравала гаспадарам памылак. Іспанцы адказвалі вострымі атакамі, якія пастаянна неслі пагрозу беларускім варотам. Так, яны таксама часта памыляліся, не вызначаліся татальным кантролем мяча, як «Баварыя», але кампенсавалі ўсё цудоўнай рэалізацыяй. Своеасаблівым «кілерам» для БАТЭ і стаў гэты непагалены хлопец Сальдада. Між іншым на радзіме яго называюць проста — «партызан». Дзейнічаў ён дзёрзка, а галоўнае — плённа, забіў усе тры мячы ў вароты нашага флагмана.

— Нялёгкі матч, — працягвае Раберта. — Ключавым стаў першы гол, бо пасля яго БАТЭ адкрылася і ў нас з'явілася больш прасторы для дзеяння. Мы вельмі добра правялі першыя хвіліны гульні і былі цалкам сфакусаваны на сваёй працы.

Яшчэ адна дэталь, якая кінулася ў вочы: БАТЭ пакуль цяжка даганяць саперніка. Ва ўсіх сустрэчах групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў барысаўчане забівалі першымі, пасля добра контратакавалі, а тут, як кажуць, іншы каленкор.

— На такім узроўні нам яшчэ цяжка гуляць першым нумарам, — кажа Аляксандр Валадзько, паўабаронца БАТЭ. — Магчыма, дзесьці можна было згуляць прасцей — выкарыстоўваць доўгія перадачы. «Валенсія» вельмі добра рэалізоўвала свае моманты, цудоўна пераходзіла ў контратаку. Гэта было нешта. Але ў першай палове яны нічога не стварылі сур'ёзнага. Перад перапынкам мы атрымалі гол у свае вароты, пасля спрабавалі выправіцца, прэсінгавалі. Вы бачылі, што з гэтага атрымалася...

Цікава, што не спужала іспанцаў і не вельмі ласкавае беларускае надвор'е. Давід Альбельда, які правёў больш за 50 матчаў за зборную Іспаніі, прызнаўся, што для падобных тэрмінаў клімат нармальны, праз месяц было б горш. А вось пазітыўнаму французу Алі Сісако, у плэеры якога пасля сустрэчы гучаў не менш пазітыўны рок-гурт «Рэд Хот Чылі Пеперс», спадабаўся стадыён і беларускія заўзятары, але дзейнічаць на дынамаўскім газоне яму было цяжка. Толькі падобнае ні ў якім разе не паўплывала на якасць гульні.

Шкада, але негатыўная традыцыя БАТЭ ў матчах з іспанскімі камандамі працягваецца. Беларусы саступілі пірэнейцам ужо ў сёмым матчы. Спадзяёмся, буйная асечка ў паядынку з «Валенсіяй» не стане пачаткам няўдачных падзей. «Паляванне працягваецца», — сцвярджае беларускамоўны банер заўзятараў БАТЭ. Галоўнае — не быць у гэтым паляванні ахвярай. Шанцы выйсці з групы барысаўчане па-ранейшаму маюць.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

**Фота Надзеі БУЖАН.**

■ Ведай нашых

# Беларускаму ўчастковаму — сярэбраны медаль

**Маёр міліцыі Міхаіл Неўдах з Віцебскага раённага аддзела ўнутраных спраў на першым міжнародным конкурсе ўчастковых інспектараў заняў другое месца.**



— Міжнародны конкурс прафесійнага майстэрства «Лепшы па прафесіі» сярод участковых упаўнаважаных паліцыі прайшоў у Екацярынбургу, — паведамілі ва Упраўленні ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. — Гонар сваіх падраздзяленняў абаранялі больш за восемдзесят участковых з розных суб'ектаў Расійскай Федэрацыі, а таксама прадстаўнікі органаў унутраных спраў Азербайджана, Арменіі і Беларусі.

Прадстаўнік цэнтральнага апарату МУС Расіі Сяргей Волкаў параўнаў участковых упаўнаважаных з урачом-тэрапеўтам. Участковы павінен быць і псіхолагам, і абаронцам, і крыміналістам, і сышчыкам.

У конкурснай праграме была здача нарматываў па службовай, баявой і фізічнай падрыхтоўцы. Пакуль адна група канкурсантаў вырашала задачы на веданне нарматыўнай базы (за гадзіну трэба было адказаць на семдзесят пытанняў, пабудаваных на аснове законаў «Аб паліцыі» і «Аб службе ў органах унутраных спраў»), другая дэманстравала ў спартзале свае фізічныя магчымасці. Іншыя канкурсанты ў гэты час аказвалі першую медыцынскую дапамогу, спаборнічалі на агнявым рубяжы. Людзям у форме трэба было прадэманстраваць веды аб «структуры» зброі, сабраць за пэўны час пісталет Макарава і выканаць нарматыў па стральбе. Цікава, што ўдзельнікам конкурсу з блізкага замежжа задачы па нарматыўных актах Расіі ў залік не ішлі, але і яны вырашылі праверыць свае веды.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

■ Сітуацыя

# ЯКОЙ ПАВІННА БЫЦЬ ПАМЯЦЬ?

**Імёны і творчасць Якуба Коласа і Янкі Маўра мне былі знаёмы яшчэ ў часы майго пасляваеннага дзяцінства. У багатай і тэматычна разнастайнай хатняй бібліятэцы майго бацькі — выкладчыка механікі адной з кафедр Беларускага політэхнічнага інстытута і заўзятага аматара кнігі — чаргаваліся руска- і беларускамоўныя выданні, а сярод апошніх «Новая зямля» і «Палескія рабінзоны» займалі адно з пачэсных месцаў.**

У далейшым здарылася так, што мае жыццёвыя сцежкі цесна перакрыжаваліся з жыццём і дзейнасцю нашчадкаў гэтых абодвух славутых людзей.

Старэйшы сын Янкі Маўра — акадэмік Фёдар Іванавіч Фёдараў — фізік-тэарэтык, стваральнік сусветна вядомай школы ў Беларусі, адзначаны Дзяржаўнымі прэміямі СССР і БССР у галіне навукі, уладальнік пачэснага звання Героя Сацыялістычнай Працы — быў не толькі маім навуковым бацькам. Мне пашчасціла знаходзіцца побач з ім на працягу сарака гадоў (1954-1994) майго жыццёвага і творчага шляху, а ў 1987 годзе пераняць з яго рук як эстафету кіраўніцтва лабараторыяй тэарэтычнай фізікі Інстытута фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, некалі заснаванай ім. Нашы з ім шматгадовыя кантакты былі не толькі навуковымі і службовымі, але ахоплівалі і іншыя, чыста чалавечыя бакі існавання. Я быў блізкім сведкам і некаторых дастаткова драматычных паваротаў у яго навуковым, грамадскім і асабістым жыцці.

З сям'ёй Міцкевічаў лёс звёў мяне недзе ў сярэдзіне 1970-х гадоў, калі мой старэйшы сын пасябраваў са сваёй аднакласніцай Верай — дачкой старэйшага сына Якуба Коласа Данілы Канстанцінавіча ад другога шлюбу з Аляўцінай Цімафееўнай. Дарэчы, з Аляўцінай Цімафееўнай я пазнаёміўся яшчэ за некалькі гадоў да таго, як Даніла Канстанцінавіч упершыню сустрэўся з ёю. У той час яна звалася проста Алай, а прозвішча Міцкевіч насіла ў якасці свайго дзявочага. І хаця інтэнсіўнасць нашага знаёмства з Данілам Канстанцінавічам была недастатковай для таго, каб наша ўзаемная сімпатыя перарасла ў сяброўства, але яе хапіла на тое, каб я адчуў, што мы з ім, калі выкарыстаць вядомую формулу Кіплінга, — «адной крыві».

Яго малодшы брат Міхась Канстанцінавіч аказаўся цікавым, іранічным чалавекам з выдатным пачуццём гумару, прычым тут прырода відавочным чынам не збіралася адпачываць і ў сэнсе наяўнасці літаратурных здольнасцяў.

З Наталляй Іванаўнай Міцкевіч (Фёдаравай) мне пазнаёміцца не давялося. Але яшчэ ад Фёдара Іванавіча я ў свой час даведаўся, што яго малодшая сястра, якая прафесійна паспяхова рэалізуе сябе, як і ўсе дзеці Маўра, у галіне дакладных і тэхнічных навук, адначасова непасрэдна ажыццяўляе саюз двух славутых беларускіх літаратурных кланаў — з'яўляецца жонкай Міхася. Дарэчы, хоць згадкі пра Наталлю Іванаўну ў працэсе нашых з Фёдарам Іванавічам шматгадовых стасункаў узнікалі эпізадычна, не больш двух-трох разоў за ўвесь час, і не былі падрабязнымі, тым не менш у мяне склалася пэўнае ўражанне, што ён ставіўся да сваёй сястры, асабліва ў час яе маленства, з вялікай цеплынёй, па-брацку, калі не сказаць — па-бацькоўску.

Улічваючы ўсе гэтыя абставіны, не дзіўна, што з'яўленне ў шэрагу нумароў часопіса «Полымя» нататак Наталлі Іванаўны Міцкевіч аб яе ўласным шляху — шляху, які звязвае паміж сабой два славутыя пісьменніцкія дамы, не магло не выклікаць маёй актыўнай зацікаўленасці.

Успаміны сапраўды вельмі змястоўныя, насычаныя звесткамі, якія дапаўняюць і добра адцяняюць разнастайныя чалавечыя рысы двух выдатных мастакоў беларускай літаратуры. Некаторыя яскравыя жыццёвыя прыклады, напэўна, шырока не вядомы і будуць цікавымі не толькі для звычайных чытачоў, але і гісторыкаў і літаратуразнаўцаў. Напісаны ўспаміны добрай, месцамі яркай і сакавітай мовай. Сустракаюцца ў тэксце асобныя фактычныя недакладнасці. Так, напрыклад, фізік Васіль Мастоўнікаў, вучоны, безумоўна, доктарскага ўзроўню, меў толькі вучоную ступень кандыдата навук і быў сапраўды лаўрэатам, але не Ленінскай, а Дзяржаўнай прэміі. Вядомы спецыяліст у галіне тэхнічных навук, член-карэспандэнт Леанід Гурскі пазіцыяніруецца як акадэмік, а пра славутага выхаванца беларускага палітэха — Аляксандра Сцепаненку — сапраўднага члена беларускай Акадэміі навук, не паведамляецца нічога, акрамя прозвішча і ініцыялаў. Але гэта — дробязі.

Маецца адна значна больш сур'ёзная рэч, пра якую, па маім глыбокім перакананні, прамаўчаць проста немагчыма і якая, уласна кажучы, і падштурхнула мяне звярнуцца ў рэдакцыю з гэтым лістом. Да чытача на працягу ўсяго аўтарскага апавядання даводзіцца, хоць і дазавана, але вельмі паслядоўна і настойліва, негатыўная інфармацыя, якая датычыцца як уласных братоў і сястры Наталлі Іванаўны, так і старэйшага брата яе спадарожніка жыцця. Такое, можа, прыйдзецца даспадобы аматарам пошуку шкілетаў у шафах славутасцяў, але ж не на іх разлічаны ўспаміны! Між тым, сам факт наяўнасці гэтага негатыву ў апублікаваным матэрыяле, які нічога не дадае (праўда, і не адымае) да светлых вобразаў абодвух волатаў беларускай культуры, міжволі кідае цень на асобу самой аўтаркі ўспамінаў.

Нават у існуючых умовах галоснасці, не абмежаванай рамкамі элементарнай прыстойнасці, калі «на продаж» літаральна штодзень выносіцца тое, пра што звычайна прынята маўчаць, усё ж варта прытрымлівацца запаветнага правіла: пра тых, хто пайшоў з жыцця — альбо толькі добрае, альбо — нічога.

Наогул, для чалавечай памяці больш характэрна ўтрымліваць з мінулага пераважна светлае і добрае, з адначасовым выцясненнем цёмнага і непрыемнага. Але часам бывае і наадварот. І тут нельга абвінавачваць таго, з кім такое здарылася. Гэта — яго бяда, і на самой справе яму можна толькі паспачуваць.

Сапраўдная адказнасць за гэты (калі ўжываць вядомы спартыўны тэрмін) відавочны фол (калі хто не ведае: фол — парушэнне правілаў гульні) ляжыць на рэдактарах, якія працавалі з рукапісам. Яны не здолелі (ці чамусьці не захацелі?) своечасова дапамагчы Наталлі Іванаўне і пераканаць яе ў неабходнасці ажыццявіць адпаведную «праполку» тэксту рукапісу, чым аказалі нядобрую паслугу безумоўна неардынарнай жанчыне, любячай і адданай дачцэ свайго знакамітага бацькі.

**Леў ТАМІЛЬЧЫК, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі НАН Беларусі**

■

■ Ёсць праблема

# ВАДА, ТРУБА ДЫ НІЗКІ ГРАДУС

**У запаветных скрынях мэблевых «сценак», у скрыначках і папках многія з нас захоўваюць няхітрыя сямейныя рэлiквii — лісты сваякоў, першыя малюнкі нашых дзяцей, школьныя «валянцінкі» з прызнаннямі ў каханні... У скрыні жыхаркі пасёлка Усходні, што на ўскрайку Баранавічаў, Тацццяны Ліпадатавай замест гэтых дарагіх сэрцу аркушаў — стос папер па «справе аб гарачай вадзе». «Справе», дарэчы, ужо больш за два гады. І за гэты час стос дасягнуў памераў таўшчэзнага тома! І ўсе — за кошт скаргаў жыхароў дома № 4 «А« і шматлікіх адказаў на гэтыя скаргі з Баранавіцкага гарвыканкама і ад мясцовых камунальнікаў. Знойдуцца тут і ледзь не штотыднёвыя акты абследавання па заханні стандартаў ацяплення і тэмпературы гарачай вады, і аб'явы аб адключэнні гарачага водазабеспячэння, і газетныя артыкулы з абяцаннямі ўрэгуляваць, нарэшце, праблему... Веры ў жыхароў пасёлка Усходні гэтым абяцанням ўжо няма.**



У доме № 4 «А» гарачая вада бывае толькі ў ацяпляльны сезон.



Так выглядае былая кацельня на ўскрайку Баранавічаў.

— Восенню 2010 года наш пасёлак адключылі ад мясцовай кацельні, якая належыла Баранавіцкім камунтеплaсеткам, і далучылі да кацельні прадпрыемства, што знаходзіцца побач — ААТ «Баранавічыдрэў». Вось тады і пачаліся нашы пакуты, — звыкла распавядае мне Таццяна Ліпадатава, пакуль на кухні мы разам спрабуем атрымаць заяўленую па нормах 50-градусную ваду — зліваем ледзь цёплую вадкасць з «гарачага» крана ўжо хвілін пяць. Градуснік упарта паказвае адзнаку 40... Сорак градусаў, дарэчы, гэта яшчэ нічога. З акта абследавання ад 13 верасня гэтага года вынікае, што ў гэты дзень тэмпература нібыта гарачай вады ў кватэры Таццяны Сямёнаўны была ўсяго 34,2 градуса, а 28 верасня і зусім — 19,1 градуса!

Яшчэ 10 гадоў таму тут, на ўскраіне райцэнтра, для жыхароў 7 шматкватэрных дамоў працавалі прадуктовы і прамтаварны магазіны, сталовая, дзіцячы сад і невялікая кацельня, якая падагравала



У акце абследавання тэмпература гарачай вады — 19,1 градуса.

ваду і забяспечвала ацяпленне кватэр у халодную пару. Той час жыхары ўспамінаюць, як жыццё ў раі: у кватэрах было цёпла, а з кранаў ліўся сапраўдны кіпень. Каму перашкодзіла старая кацельня, зараз высвятліць немагчыма. Але вясной 2010 года жыхары пасёлка Усходні са здзіўленнем даведаліся, што з гэтага часу за цяпло ў іх кватэрах і за гарачую ваду ў кранах адказвае суседняе прадпрыемства — ААТ «Баранавічыдрэў». Усё б нічога, калі б не фінансавае становішча прадпрыемства. Ужо з дзясятак гадоў ААТ сядзіць у даўгах як у шаўках. Некаторы час таму жыхары пасёлка ўсё ж спадзяваліся, што сістэму ацяплення і водаправод усё ж такі падключаць да старой кацельні. Але калі з яе напаўразбуранага будынка зрэзалі высачэзную металічную трубу, а ў памяшканні кацельні абсталявалі цеплапункт, зразумелі: вяртання да былога шчасця не будзе.

Нельга сказаць, што на бясконцыя скаргі жыхароў улады не рэагавалі. Не, ім адказвалі своечасова, збіралі сходы, на якіх расказвалі аб часовых цяжкасцях, і клятвенна запэўнівалі, што гарачая вада ў дамах будзе. Праўда, не штодня, а па графіку — чатыры разы на тыдзень. Узрадаваныя жыхары беглі да кранаў, а з іх лілася ўсё тая ж цёпленькая або халодная вадзіца.

— Аб праблеме пасёлка Усходні мы ведаем, — шчыра прызнаўся ў тэлефоннай размове са мной генеральны дырэктар прадпрыемства «Баранавіцкая гарадская ЖКГ» Рыгор Касабуцкі. — Але мы адказваем толькі за размеркаванне вады, падагрэў яе ажыццяўляе «Баранавічыдрэў». На прадпрыемстве быў адключаны газ, а магутнасці катла, які працуе на драўняным паліве, відавочна не хапала. Адсюль і невыкананне тэмпературнага рэжыму. Але ўчора ў кацельні падключылі газавыя катлы, і вада павінна быць гарачай...

Услед за нумарам галоўнага камунальніка Баранавічаў набіраю нумар начальніка гаспадаркі «Баранавічыдрэў» Аляксандра Яцука. Менавіта ён «у адказе» за праславутую кацельню.

— Не, мы не ўключалі газ, — здзіўлены ён. — Палім кацёл дранкай. І даём нармальную тэмпературу вады. І праблема зусім не ў нас, а, па-першае, у цеплапункце камунальнікаў — менавіта ён размяркоўвае гарачую ваду. І, па-другое, — у цеплaсетках дома № 4 «А». У іх тупіковая «ветка», без так званага «звароту». Адсутнічае рэцыркуляцыя гарачай вады, таму і тэмпература нізкая. Жыхарам трэба зліваць шмат вады з водаправода, каб пайшла гарачая. Але ў іх стаяць лічыльнікі, і ўсе гэтыя кубаметры злітай вады — толькі за іх кошт. Вось жыхары і эканомяць... А мы і так падаграваем ваду пасёлку сабе ў страту!

Дарэчы, «ветка» са «зваротам« дому № 4 «А» абяцана гарадской уладай толькі ў 2015 годзе. А да тых часоў, мяркуючы па ўсім, гарачая вада ў кватэрах будзе з'яўляцца толькі ў ацяпляльны сезон — гэта значыць, тады, калі завадская кацельня атрымлівае доступ да газу.

Увогуле, усё як у той прымаўцы: «Тыя ківаюць на гэтых, а дом усё не падмецены». І людзі, якія жывуць у пасёлку Усходні, адчуваюць сябе нікому не патрэбнымі, лішнімі. Бо на ўскрайку Баранавічаў вялікая частка жыхароў — пенсіянеры і інваліды, вымушаныя бавіць свой час у неўладкаваных дварах без асфальту і асвятлення, у халодных кватэрах без гарачай вады, па суседстве з чыгункай, а значыць, у шуме і пыле. І нават аўтобус у забыты уладай куток ходзіць усяго адзін раз у гадзіну. І тое — да васьмі вечара...

**Таццяна ГРЫНКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# ЯК СТАЦЬ «ТЭРЫТОРЫЯЙ ПОСПЕХУ»?

## МЯСЦОВЫМ ІНІЦЫЯТЫВАМ ПА РАЗВІЦЦІ АГРАЭКАТУРЫСЦКАГА БІЗНЭСУ БУДЗЕ АКАЗАНА ФІНАНСАВАЯ ПАДТРЫМКА

**Ёсць цікавая ідэя ў сферы аграэкатурызму, але не хапае стартавага капіталу для яе ажыццяўлення? Тады вам можа дапамагчы праект «Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё», які рэалізуецца Праграмай развіцця ААН з удзелам Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці і Міністэрства спорту і турызму Беларусі. Агульны бюджэт праекта, які накіраваны на павышэнне ролі прыватнага сектара ў эканоміцы Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, складае 1 мільён 946 тысяч амерыканскіх долараў.**



У сядзібе «Каралінскі фальварак Тызенгаўза».

Аднак у гэтай сферы, якая можа стаць эфектыўным інструментам развіцця эканомікі сельскіх тэрыторый, стварэння новых рабочых месцаў, пакуль не задзейнічаны значны патэнцыял для росту. Адсюль і мэта праекта: аказаць фінансавую падтрымку мясцовым ініцыятывам у гэтым кірунку, зазначыў на прэзентацыі праекта ў Гродне **намеснік прадстаўніка Праграмы развіцця ААН у Рэспубліцы Беларусь Фарыд КАРАХАНАЎ.** І разам з тым, скарыстацца міжнародным вопытам дзеля насычэння працы аграсядзібаў якасным зместам, лічыць **дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі Вадзім КАРМАЗІН.**

Мяркуецца, што праект прафінансуе дзве буйныя ініцыятывы з бюджэтам да 50 тысяч долараў і трыццаць ініцыятыў — да 15 тысяч долараў. Пераможцаў вызначаць на конкурснай аснове (умовы конкурсу — на сайце ПРААН у Беларусі), прычым рашэнне аб фінансаванні мясцовых ініцыятыў будзе прымацца з абавязковым улікам іх уздзеяння на прыроднае асяроддзе.

— Разлічваем, што на аснове дзяржаўна-прыватнага партнёрства будзе распрацавана стратэгія развіцця экатурызму па меншай меры для 16 пілотных тэрыторый у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях, — паведаміў **дарадчык праекта па турызме Аляксандр ТАРАСЁНАК.**

Пры гэтым суб'ектам экатурызму будзе аказана і інфармацыйная падтрымка шляхам унясення звестак у існуючыя электронныя базы звестак і сістэмы GPS, размяшчэння інтэрактыўных картаў у інтэрнэце.

Акрамя таго, праект дапаможа ўладальнікам малога і сярэдняга аграэкатурысцкага бізнэсу і арганізацыям яго падтрымкі ўдасканаліць свае прафесійныя звычкі, веданне замежных моў і камп'ютара. А заканадаўцам будуць прапанаваны рэкамендацыі па ўдасканаленні нарматыўна-прававой базы аграэкатурызму з мэтай стымулявання развіцця прыватнага сектара ў гэтай сферы.

Дарэчы, даволі сімвалічна, што месцамі прэзентацыі гэтага праекта ў Прынямонні сталі сядзіба «Каралінскі фальварак Тызенгаўза» і агратурыстычны комплекс «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы». Зразумела, не кожнаму па сілах такія маштабныя праекты. Але ж усе пачыналася з жадання, ідэй і творчага падыходу да іх увасаблення ў жыццё. У гэтым, пэўна, а не толькі ў грошах, аснова «тэрыторыі поспеху».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**

**ДЛЯ ДАВЕДКІ:**
***У апошнія гады аграэкатурызм ў Беларусі развіваецца вельмі дынамічна. Летась колькасць суб'ектаў аграэкатурыстычнага бізнэсу ў цэлым па краіне павялічылася да 1576 — гэта на 26 працэнтаў больш у параўнанні з 2010 годам.***

# ХОЧАШ ВЫРОШЧВАЦЬ БУЛЬБУ — ШУКАЙ СРОДКІ НА СХОВІШЧА

**Кожны дзень, калі іду з працы ўвечары, у сваім мікрараёне Кавалёва сустракаю гандляроў, якія з машын прадаюць бульбу, затараную ў мяхі-сеткі. Цана вельмі дэмакратычная — 2 тысячы рублёў (на асенніх кірмашах у Брэсце, якія праходзяць па выхадных, можна купіць яшчэ танней). Гаспадары машын гатовы даставіць мяхі літаральна да пад'езда любому вячэрняму пакупніку. Бульба сёлета ўрадзіла. І тыя, хто можа прадаць лішкі сваёй прадукцыі ў гарадах, крыху зарobяць. Віскоўцы ж часам прадаюць «другі хлеб» заезджым купцам зусім за бясцэнак. Так, жыхары пасёлка Жамчужны Баранавіцкага раёна аддавалі частку свайго ўраджаю гэтай восенню па 700 рублёў за кілаграм. Пакуль што не могуць пахваліцца заробкамі і сельгаспрадпрыемствы.**

У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай развіцця бульбаводства, агародніцтва і пладаводства і даручэннем Прэзідэнта РБ у Брэсцкай вобласці да канца гэтага года запланавана ўвесці ў строй 17 сучасных бульбасховішчаў. Агульная ёмістасць аб'ектаў павінна была скласці каля 130 тысяч тон.

У вобласці сёння 115 гаспадарак вызначаны базавымі для вырошчвання бульбы, гэта значыць, адводзяць пад пасеў «другога хлеба» 100 і болей гектараў. Бо менавіта такі, а не меншы «клін» дазваляе забяспечыць безумоўнае выкананне тэхналогіі пры вырошчванні. Усе названыя гаспадаркі або маюць сучаснае бульбасховішча, альбо вядуць работы па ўзвядзенні новых аб'ектаў ці рэканструкцыі былых памяшканняў.

Супрацоўнікі Дзяржкантролю не выпускаюць гэта пытанне з поля зроку. Вось і ў чарговую паездку па гаспадарках галоўны спецыяліст упраўлення КДК Брэсцкай вобласці Дзмітрый Прыходзька запрасіў журналістаў.

У СВК «Усход-Камянец» Камянецкага раёна бульбу вырошчвалі на 270 гектарах. Зараз падыходзіць да завяршэння яе ўборка. Ураджайнасць набліжаецца да 300 цэнтнераў з гектара. У гаспадарцы ёсць прыстасаваныя бульбасховішчы. Таксама вядзецца будоўля новага — на 8 тысяч тон. Першая чарга бульбасховішча ёмістасцю ў дзве тысячы тон павінна здавацца ў снежні. Сцены памяшкання ўзведзены, на будоўлі працуюць два-тры рабочыя, але да здачы яшчэ далёка — застаўся вялікі кавалак работы. Відавочна, што сёлета аб'ект не будзе завершаны. Дырэктар СВК Андрэй Зялёнка не стаў спяшацца з каментарыямі, відаць, на гэта ў яго ёсць свае прычыны. Як удалося высветліць з неафіцыйных крыніц, зацягваецца крэдытаванне аб'екта. Крэдыт як быццам выдзелены, але грошай банк не дае. Так што ўвод у строй бульбасховішча часова адкладваецца.

У суседняй гаспадарцы — СВК «Стаўскі» — пасаджана 40 гектараў бульбы. У дзень нашага прыезду актыўна вялася яе ўборка, на полі працавалі навучэнцы Столінскай сярэдняй навучальнай установы. Ураджай на асобных участках даходзіць да 400 цэнтнераў з гектара. «Цэны на бульбу няма», — са шкадаваннем гаворыць галоўны аграном гаспадаркі Сяргей Пракопчык. — Адборную бульбачку ў сетках заезджыя купцы бяруць па 800-1000 рублёў за кілаграм. На крухмальных заводы клубні здаюцца зусім за бясцэнак.

Да 1000 тон тут мяркуюць закласці ў бурты. Работа ідзе. Але як захаваецца ўраджай у буртах, невядома. Тым больш што ёсць у аграномічнай службы пытанні да якасці насення, якое купілі ў насенняводчай гаспадарцы. Брыгадзір СВК паказала нам асобныя пашкоджаныя пры выкопванні клубні, якія не падсыхаюць на зрэзе, а мокнуць. Такія бульбіны могуць загніваць у працэсе захавання.

Вялікую частку ўраджаю, як і летась, у «Стаўскім» мяркуюць скарміць жывёле. Калі б бульбасховішча паспелі ўзвесці ў суседнім сельгаспрадпрыемстве «Усход-Камянец», бульбаводы са Стаўяў маглі б арандаваць там адзін-два адсекі. А так — застаюцца бурты.

...Нядаўна давялося пабываць на бульбасховішчы эксперыментальнай базы «Белавусаўшчына» Пружанскага раёна і на свае вочы ўбачыць, як трэба захоўваць «другі хлеб» у сучасных умовах. Аптымальная тэмпература, асобны адсек для кожнага гатунку прадукцыі, які не дае ім змешвацца і гарантуе давер патэнцыяльных пакупнікоў. Такі ж сучасны з улікам усіх тэхналагічных патрабаванняў ангар для захавання бульбы ўзведзены ў ААТ «Айчына» названага раёна.

Зразумела, што бульбасховішча дае магчымасць прадаваць хадавы тавар у любую пару года, калі ўстанаўліваецца прымальная цана, а не аддаваць за бясцэнак першаму сустрэчнаму пакупніку ці пускаць на корм жывёле. І даўнейшы дзедаўскі спосаб закладвання бульбы ў бурты прыводзіць да вялікіх страт прадукцыі. Так што той, хто мае намер вырошчваць бульбу, мусіць вышукваць сродкі на сховішча. Бо гэта адзіны цывілізаваны шлях развіцця бульбаводства.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

25 КАСТРЫЧНІКА 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 20 (15706)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года


Дзядзька ВАНЯ:

# «Я ЎВЕСЬ ЧАС ШУКАЮ ПРЫГОДЫ НА САВЮ ГАЛАВУ»



**Іван Вабішчэвіч, ён жа Дзядзька Ваня, — фігура вядомая на прасторы беларускага шоу-бізнэсу. Ён выкладае ва ўніверсітэце, працуе вядучым на радыё і тэлебачанні. Таксама паспяхова гастралюе з гуртом «Ван Хельсінг». На першы погляд, можна купіцца на яго эпатажнасць. Але, як зазначае сам Іван, у гэты стыль паводзін укладваецца толькі яго шчырасць. Быць у трэндзе для яго не галоўнае. Важнай лічыць філасофію, паводле якой галоўнае — быць асобай і мець на ўсё сваё меркаванне. Магчыма, гэта і ёсць сакрэт поспеху, які робіць яго не падобным да іншых, але ўсё адно застаюцца пытанні...**

**— Іван, што адчуваеце перад выхадам на сцэну?**

— Задавальненне. Часам яно знаходзіцца на мяжы з каласальнай стомленасцю. Але калі б не было задавальнення, то я наогул не займаўся б гэтай справай. У працэсе, безумоўна, прысутнічае хваляванне, але яно выліваецца ў нейкі адрэналін, калі адчуваеш энергію аўдыторыі.

**— Ваш гурт існуе ўжо шэсць гадоў. Якія выступленні пакінулі ў памяці найбольш яркія ўспаміны?**

— Шмат ёсць момантаў, якія можна прыгадаць. Шэсць гадоў — гэта не так і многа, але здараліся розныя змены ў гурце. Прыгадваецца наша выступленне на першым байк-злёце, калі ў рэпертуары было недзе толькі дзевяць песень. Запомніўся і канцэрт, калі мы выпусцілі першы дыск. Самым маштабным, бадай што, можна лічыць выступленне каля сцен Мірскага замка. Гэта было шоу самага высокага ўзроўню. Для мяне асабіста конкурс «Новая хваля» — гэта вялікая вяха. Я там быў адзін, але ўскосна мы там былі з камандай.

**— Якая перадгісторыя сустрэчы людзей, з якімі вы працуеце ў гурце?**

— Спачатку я напісаў толькі адну песню, і, шчыра кажучы, нават ніколі не думаў, што гэта можа ў нешта выліцца. Потым усё пачало абрастаць людзьмі, падзеямі. Неяк на адным са свят, дзе я быў вядучым, мы сустрэліся з людзьмі, якія там гралі інструментальную музыку. Так мы і знайшліся ў прасторы і часе. Закруцілася. Потым былі розныя перыпетыі, а з цягам часу сабралася тая «сямейка», якая займаецца сёння гэтай справай.

**— Калі вашым прыхільнікам чакаць новага альбома?**

— Мы даўно працуем над новым альбомам. Ён павінен быў з'явіцца на свет паўгода таму. Усё амаль што было падрыхтавана, але неяк рукі не дайшлі. Зараз канцэпцыя, здаецца, акрэслілася. Там з'явіліся тры новыя песні. І, хочацца верыць, што ў хуткім часе альбом будзе завершаны. Не ведаю, праўда, як наконт выпуску дыскаў. Хутчэй за ўсё, гэта будзе такая серыя для себе. Таксама песні выкладзем у інтэрнэце. Таму шукайце нас у сусветным павуцінні.

**— Інтэрнэт дазваляе наблізіцца да сваёй аўдыторыі?**

— Скажам так, інтэрнэт — добрая пошукавая сістэма. Зараз час такі. Дыск можна запісаць, і ён будзе прадавацца ў двух-трох крамах. Маштабы сусветнага распаўсюджвання — наогул з разраду фантастыкі. Ды і менталітэт у нас такі, што калі нешта бясплатнае, то — з вялікім задавальненнем, а набыць дыск, каб артыст меў з гэтага нейкі прыбытак, то не. Я не імкнуся зарабляць на дысках грошы. Няхай слухаюць тыя, каму падабаецца. А потым можаце запрашаць нас у госці, прыходзіць да нас на канцэрты.

**— У прэсе вас лічаць вядомай у беларускім шоу-бізнэсе фігурай. Адчуваеце сваю папулярнасць?**

— Тое, што мяне пазнаюць і ведаюць, — факт. Але ніхто не стаіць пад маімі вокнамі з кветкамі і не крычыць: «Хачу нарадзіць ад цябе дзіця», дзякуй Богу, гэта таксама факт. Я такі чалавек, што ўвесь час шукаю прыгоды на сваю галаву. Мне сумна займацца нечым адным, таму нехта бачыць мяне на тэлебачанні, хтосьці чуе па радыё, а камусьці падабаецца наша музыка, і ён прыходзіць да нас на канцэрты.

**— Як ахарактарызавалі б уласны стыль жыцця?**

— Хаатычны. Прычым у гэтым хаосе я імкнуся знайсці магчымасці, каб больш часу правесці з сям'ёю. Таксама ў гэтай атмасферы хаосу я хачу спрабаваць і прыдумляць нешта новае.

**— Кажуць, у дзяцей можна многаму павучыцца. Чаму вас вучыць дачка Мірaслава?**

— З яе падачы нядаўна напісаў песню. Паназіраў за ёю — і нарадзілася дарослая кампазіцыя. Проста дзеці заўсёды робяць тое, што ім падабаецца. Рэагуюць, як хочуць. І ў гэтым вялікая шчырасць.

**— Вашыя ўяўленні пра спадарожніцу жыцця супалі з рэальнасцю, калі сустрэлі сваю будучую жонку?**

— Думаю, так. Бо ў юнацкім узросце існуюць нейкія вобразы, падабаецца плакатная знешнасць. А потым разумееш, што ў дзяўчыне павінна быць нешта большае. Для мяне было важна, каб дзяўчына ўмела ўжыцца з маімі «прусакамі» ў галаве. У гэтым сэнсе мы знайшлі адно аднаго. Магчыма, нават спачатку пасябравалі нашы «прусакі», а потым — і мы.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

*Дах над галавой*

# ХОСТЭЛ:
## танны начлег з вясёлымі суседзямі



**Многія, збіраючыся ў іншы горад, часта не ведаюць, дзе спыніцца. У гасцініцы, часцей за ўсё, дорага, а пошук кватэры ці пакоя займае пэўны час... Універсальны варыянт — наяўнасць у такім горадзе знаёмых. Але што рабіць, калі іх няма? Што рабіць, калі вы ўпершыню прыехалі, напрыклад, у Мінск, Маскву і Варшаву па нейкіх справах (напрыклад, на канцэрт), а лішніх грошай не маеце? У такім выпадку лепш за ўсё пайсці ў хостэл — недарагую гасцініцу. Вядома, гэта не самае камфортнае месца, але ёсць ложак і дах над галавой. А таму чаму б і не паспрабаваць?**

### На саломе ўжо не спяць

Хостэлы — недарагія гасцініцы — з'явіліся ў Еўропе на пачатку мінулага стагоддзя, калі нямецкаму настаўніку прыйшло ў галаву прымаць падарожнікаў, якія спыняліся ў яго горадзе, на тэрыторыі школы. Пасля заняткаў вучні выносілі з класаў парты, а на змену ім прыносілі мяшкі, набітыя саломай. За невялікую плату вандроўнікі заставаліся начаваць, а раніцай выносілі свае самаробныя «матрацы» і вярталі назад парты. Хутка такая практыка прыжылася. У нашы дні ў еўрапейскіх гарадах хостэлы карыстаюцца вялікай папулярнасцю, асабліва сярод моладзі, якая падарожнічае і не мае лішніх грошай, а таксама сярод падарожнікаў і людзей, якія прыехалі на канцэрт, конкурс і г.д.

У нашай краіне хостэлы пачалі з'яўляцца зусім нядаўна (з лета мінулага года). Але колькасць іх паступова расце, бо неўзабаве ў нас пройдзе чэмпіянат свету па хакеі, а недарагія гасцініцы — якраз тое, што патрэбна яго наведвальнікам. Пакуль што ў Мінску адчуваецца дэфіцыт танных варыянтаў для начлегу. Зараз у горадзе налічваецца сем хостэлаў і іх, зразумела, недастаткова, каб забяспечыць недарагім жытлом усіх, у каго ўзнікне жаданне пабываць на чэмпіянаце.

### Хостэл па-нашаму — на «перыферыі»

Як правіла, асноўная функцыя хостэлаў — прадаставіць прыезджым недарагое ложка-месца. Звычайна хостэлы размяшчаюцца ў катэджах, таму адначасова могуць змясціць да 50-60 чалавек. Асаблівым камфортам пакой у хостэле наўрад ці будзе вылучацца, бо там можа пражываць (прынамсі, у мінскіх) ад 4 да 18 чалавек. У недарагіх гасцініцах звычайна ёсць агульная кухня, дзе можна прыгатаваць сабе што-небудзь паесці, і агульныя санвузлы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

*Недзіцячыя гульні*

# ПЕРАХОДНЫ ЎЗРОСТ:
## *не перайсці мяжу...*

**Падчас пераходнага ўзросту падлеткі знаходзяцца на самай блізкай адлегласці ад уяўнай мяжы, якая дзеліць усе нашы ўчынкі на законныя і незаконныя. Спроба самасцвердзіцца, жаданне мець тое, на што не хапае грошай у бацькоў, або проста імкненне прыцягнуць увагу — усё гэта часта не дае ўбачыць такую мяжу. Пасля разбіральніцтваў у школе або раённай інспекцыі па справах непаўналетніх некаторыя з іх пачынаюць разумець, наколькі страшна парушыць сваё жыццё з-за раптоўнага, непрадуманага жадання. Але ёсць і такія, для каго першыя парушэнні закона адкрываюць дарогу ў «новае» жыццё. Пра такіх «цяжкіх» падлеткаў і распавяла начальнік інспекцыі па справах непаўналетніх Мінскага РУУС, падпалкоўнік міліцыі Вольга Чамаданава. Яна ў інспекцыі — ужо 13 гадоў. Так атрымалася, што зараз даводзіцца працаваць з тымі «цяжкімі» падлеткамі, чые бацькі таксама ў свой час парушалі закон...**

### ГАЛОЎНАЕ — ПАПЯРЭДЗІЦЬ

Па словах Вольгі Чамаданавай, з 2006 года правапарушэнняў стала менш. Гэта можна звязаць як з тым, што падлеткі сталі больш дысцыплінаванымі, так і з такімі фактарамі, як змена заканадаўчай базы, кантроль з боку школ у адносінах да тых вучняў, што часта парушаюць дысцыпліну і, у прынцыпе, у будучым могуць сур'ёзна парушыць закон.

Найбольш дзейсным паказала сябе ранняе выяўленне непаўналетніх правапарушальнікаў. У гэтым узросце яшчэ можна неяк паўплываць на хлопцаў і дзяўчат, бо інакш яны загубяць сваё жыццё.

Згодна са статыстыкай, за першае паўгоддзе гэтага года колькасць злачынстваў вырасла, аднак, што парадаксальна, саміх непаўналетніх злачынцаў стала менш. Так атрымліваецца па той простай прычыне, што адзін падлетак можа, уцягнуўшыся ў небяспечную гульню з законам, здзейсніць некалькі парушэнняў.

### ТАКІ ВОСЬ «РЭКАРДСМЕН»...

Адзін хлопчык учыніў ажно дваццаць злачынстваў! І не за ўсё сваё жыццё, а пасля таго, як яму споўнілася чатырнаццаць гадоў. Прычым Вольга Мікалаеўна разупэўнівае: усё, што патрэбна ў такім узросце падлетку, у яго было.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
25 10 2012 г.

# ХОСТЭЛ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Часта хостэлы прадастаўляюць сваім пастаяльцам пральную машыну, а таксама настольныя гульні, бясплатны wi-fi, у некаторых выпадках — тэнісны корт на вуліцы, барбекю, шашлыкі. У некаторых хостэлах днём знаходзіцца непажадана. Таксама адміністрацыя такіх гасцініц можа ўстанавіць час прыходу ў хостэл вечарам.

Асабліва, у прыватнасці, мінскіх хостэлаў, у адрозненне ад аналагічных гасцініц у Еўропе, з'яўляецца іх месцазнаходжанне. Там яны размяшчаюцца ў цэнтры горада, а ў Мінску — дзесьці «на перыферыі». Што да кошту, то тут беларускія цэны мала чым адрозніваюцца ад еўрапейскіх. Кошт ложка-месца напрамую залежыць ад колькасці чалавек у пакоі. Чым больш народу, тым меншая цана. Так, у адным з мінскіх хостэлаў цана за суткі — больш чым дэмакратычная, — 78 тысяч рублёў. Але і людзей там будзе, скажам так, нямала — васямнаццаць чалавек у пакоі (пры поўным запаўненні). У тым жа хостэле за ложак у нумары з чатырма спальнымі месцамі прыйдзецца заплаціць 130 тысяч у суткі, з шасцю — 120, з дванаццаццю — 111, з чатырнаццаццю — 94 тысячы рублёў.

Відаць, нялішнім будзе пералічыць, што ўваходзіць у вышэйназваны кошт. Звычайна хостэлы прапануюць набор бялізны, ручнік (адзін або некалькі), у некаторых выпадках — аднаразовыя тапачкі, каву/гарбату, бясплатны бесправодны інтэрнэт.

## Творчая атмасфера для творчых людзей

Хостэлы ідэальна падыходзяць для людзей, якім падабаецца заводзіць новыя знаёмствы, — сапраўды, суседзі з розных краін могуць шмат чаго расказаць пра сваю культуру і традыцыі, прыгатаваць што-небудзь смачненькае з нацыянальнай кухні... Частымі наведвальнікамі хостэлаў таксама з'яўляюцца вялікія кампаніі. Час ад часу ў іх аб'ядноўваюцца творчыя людзі, якія цікавяцца мастацтвам той краіны, у якую прыязджаюць. І ведаеце што? Для творчых асоб існуюць у Мінску хостэлы, якія пазіцыяніруюць сябе менавіта як цэнтры канцэнтрацыі творчых людзей — музыкантаў, акцёраў, мастакоў... У такіх хостэлах адчуваецца сапраўдная творчая атмасфера!

**«Тыповы пастаялец хостэла — хлопец з заплечнікам 22-26 гадоў. Ён можа падарожнічаць адзін, з дзяўчынай або ў кампаніі».**

Вось такога кшталту хостэл і вырашыла я наведаць. Яго гаспадыня — Ксенія Курусь — прапанавала мне прыйсці напярэдадні яго адкрыцця: ужо праз дзень пасля майго прыходу туды планавалася заязджаць першая група пастаяльцаў.

Ксенія Курусь адкрыла свой першы хостэл пад назвай «Traveler» у маі гэтага года. Пачатак аказаўся ўдалым, таму дзяўчына вырашыла працягнуць справу і адкрыць яшчэ адну недарагую гасцініцу для падарожнікаў. На старонцы «УКантакце» і на ўласным сайце ў інтэрнэце «Traveler» пазіцыяніруе сябе як «арт-хостэл». Новая гасцініца будзе звацца або «Арт-хостэл», або «Алекс-хостэл».

— Справа ў тым, што наш хостэл «сябруе» з грамадскім аб'яднаннем «Будзь калекцыянерам», — распавядае Ксенія. — Таму на сценах вісяць карціны сучасных мастакоў, і любую з гэтых карцін кожны ахвотны можа купіць.

Яшчэ хостэл завецца творчым па той простай прычыне, што тут часта ладзяцца майстар-класы, вечарыны, канцэрты, а яшчэ тут спыняюцца музыканты, мастакі і іншыя творча арыентаваныя асобы.

— Не так даўно да нас прыязджала група з трыццаці маладых людзей, — прыгадвае з усмешкай Ксенія. — Яны былі з розных краін — Вялікабрытаніі, Славакіі, Італіі, Арменіі. Ладзілі вясёлыя тусоўкі кожны дзень! Увогуле, на базе хостэла мы арганізоўваем розныя вечарыны, на якія ўваход часта бясплатны.

## Наведвальнік хостэла — хлопец бывалы

Ксенія нядоўга думае перад тым, як апісаць тыповага пастаяльца сваіх хостэлаў: «Гэта хлопец з заплечнікам 22-26 гадоў. Ён можа падарожнічаць адзін, з дзяўчынай або ў кампаніі. Да прыезду ў Мінск ён ужо шмат дзе пабываў, а выбраў наш хостэл таму, што прывабілі яго шматлікія мерапрыемствы, якія мы ладзім, а таксама творчая атмасфера. Звычайны пастаялец застаецца ў нас прыкладна на два дні і, вядома ж, ён вельмі вясёлы».

Тым не менш маладая гаспадыня адзначыла, што неяк прыязджалі з Масквы дзядуля і бабуля, якія выкупілі шасцімесны пакой і засталіся вельмі задаволены ўмовамі пражывання. Таксама прыязджаюць сем'і, якія могуць выкупаць для сябе ўсе ложкі ў пакоі: відаць, каб адчуваць сябе «як дома». Некаторыя ж пастаяльцы, наадварот, просяць, каб іх пасялілі ў пакой з самай вялікай колькасцю людзей — так весялей!

## Каб жылося ў чысціні і парадку. І нядорага

Зараз у новым хостэле засталося толькі дарабіць некаторыя дробязі. Ён разлічаны на 25 чалавек, цэны — ад 16 долараў. Пакоі не вельмі вялікія — па 5-6 чалавек, але ёсць і пакой на дваіх.

Ксенія ў хостэльным сектары гасцінічнага рынку не так даўно, але планує працягнуць развіваць сваю сетку, тым больш, што і першы, і другі крокі ўжо зроблены. «У гасцініцы «Еўропа» самы танны нумар каштуе 200 долараў, — заўважае дзяўчына. — А вось для людзей, якія не маюць такіх грошай, прапаноў недастаткова. Усе хочуць жыць у чысціні і парадку, але часта за невялікія грошы мала што можна знайсці. Вось я і вырашыла заняць гэтую нішу».

Цікава, што, каб палепшыць сітуацыю ў сталіцы з недарагім арэндным жыллём, гарадскія ўлады зацвердзілі праект трох адназорказых гасцініц, будаўніцтва якіх павінна быць завершана да 2014 года, калі ў Беларусі чакаецца вялікі прыток замежных гасцей. Таму будзем спадзявацца, што мы, беларусы, зноў пацвердзім сваю гасціннасць як на чэмпіянаце свету па хакеі, так і ў звычайным, будзённым жыцці, бо з кожным годам колькасць ахвотных наведаць нашу краіну павялічваецца.

### ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ

✓ *Хостэл часам можа стаць своеасаблівай альтэрнатывай студэнцкаму інтэрнату. Так, студэнты адной з навучальных установ Мінска заключылі спецыяльны кантракт з уласнікам хостэла на дастаткова працяглы тэрмін. Умовы там не такія строгія, як у некаторых інтэрнатах, а вось атмасфера — сапраўды студэнцкая.*

✓ *Некаторыя замежныя хостэлы, клапоцячыся пра камфорт сваіх пастаяльцаў, абсталёўваюць пакоі ложкамі спецыяльнага дызайну: гэта як маленькія пакойчыкі-соты з добрай гукаізаляцыяй. Залазіш у такую карobку, зачыняешся — і хочаш сабе спі, хочаш — уключы лямпу і займайся сваімі справамі.*

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*Дай лапу, сябар*

# ПРОСТА БУДЗЬ ПОБАЧ...

**Аднойчы на форуме грамадскага аб'яднання па ахове жывёл «Эгіда» з'явілася паведамленне, што недзе ў Лошыцы трымаюць на ланцугу хворага шчанюка, здольнага перамяшчацца толькі паўзком. Калі валанцёры «Эгіды» прыбылі на месца, яны былі ўзрушаны ўбачаным: асфальт вакол будкі шчанюка быў пакрыты крывавымі паласамі, шчанюк перасоўваўся на скалечаных лапах, здзіраючы мяса да касцей...**



Дзякуючы валанцёрам сабака, названы Крысмасам, выжыў. Зараз ён знаходзіцца пад наглядам, але па-ранейшаму мае патрэбу ў дапамозе на мінімум пяці куратараў. Зараз жа яго даглядаюць толькі двое.

Калі б такое здарылася ў краінах Заходняй Еўропы, шчанюку была б аказана дапамога на вышэйшым узроўні. Стаўленне да жывёл там усё ж адрозніваецца ад нашага. Так, нядаўна ў Лонданскім заапарку была праведзена аперацыя рыбцы Карле. Джэймс Олівер, супрацоўнік Лонданскага акварыума, дзе Карла жыла на працягу 10 гадоў, патлумачыў: «Я разумею, што гэта крыху здзіўляе, калі аперыруюць маленькую трапічную рыбку. Але ж яна для нас амаль частка сям'і». У Вялікабрытаніі афіцыйна забаронена ўтрымліваць дома ката ў адзіноце, калі ён не можа выйсці на вуліцу. У Германіі, калі гаспадар выганяе хатнюю жывёлу, гэта кваліфікуецца як жорсткае абыходжанне і караецца штрафам у памеры 25 тыс. еўра. У нас жа не лічыцца непрыстойным выкінуць свайго гадаванца на вуліцу, калі ён прычыняе нязручнасці.

Штогод у адным Мінску адлоўліваецца 10 тысяч бяздомных сабак і катоў. Далей іх транспартуюць у пункты адлову і часовага ўтрымання жывёл. У Мінску гэта ДП «Фаўна горада», дзе афіцыйна адлоўленая жывёла можа ўтрымлівацца толькі пяць сутак, затым яе падвяргаюць эўтаназіі. Многія хатнія гадаванцы, якія не прывыклі да такога абыходжання, пакутуюць на першыя суткі ад стрэсу.

На шчасце, з нядаўніх часоў існуе альтэрнатыва такому жорсткаму абыходжанню. У Беларусі людзі, якім неабыякавы лёс братоў нашых меншых, ствараюць грамадскія аб'яднанні абароны жывёл. Першай такой арганізацыяй стала ГААЖ «Эгіда», зарэгістраваная ў 2006 годзе. Пазней на яе аснове ўтварыліся новыя аб'яднанні — такія, як «Кот і Сабака», «Суперкот» і іншыя.

Людзі, якія добраахвотна займаюцца дапамогай жывёлам, называюцца валанцёрамі.

Да валанцёрства прыходзяць рознымі шляхамі. Святлана стала працаваць з жывёламі па волі выпадку.

Будучы студэнткай, яна трымала дома кошку. Пэўны час у яе жыла і марская свінка. Але пра тое, каб сур'ёзна заняцца дапамогай жывёлам, Святлана не думала. Аднойчы ёй на пошту прыйшла рассылка ад ГААЖ «Эгіда», у якой змяшчалася просьба аб грашовай дапамозе, каб аплаціць арэнду «Кацінага кутка». Святлана прыйшла туды, каб аддаць грошы, і была скорана відовішчам дзесяці пухнатых камячкоў, якія прагнулі чалавечай ласкі і ўвагі. Праз два дні роздуму дзяўчына вырашыла стаць валанцёрам у «Эгідзе». Пазней, у 2011 годзе, яна ўвайшла ў групу добраахвотнікаў, якія ўтварылі самастойнае аб'яднанне па абароне жывёл і назвалі яго «Кот і Сабака», а прасцей кажучы, «КіС». Зараз Святлана рэгулярна выходзіць на дзяжурства ў так званую «Хатку» — прыватны дом, дзе ўтрымліваюцца каля 20 катоў і тры сабакі. Нягледзячы на колькасць гадаванцаў, яна сцвярджае, што даглядаць іх нескладана.

*— У змену выходзяць звычайна «кашатнік» і «сабачнік», —* дзеліцца сакрэтамі догляду Святлана. *— У дзень працуюць дзве змены — ранішняя і вячэрняя. Ранішняя дазваляе прыцягнуць студэнтаў, а ў вячэрнюю выходзяць людзі, якія працуюць. Прыходзім і адразу ідзём гуляць з сабакамі. Калі да катоў — то спачатку кормім іх прысмакамі. Не толькі каб папесціць, але і каб адсачыць іх стан. Калі хтосьці не есць, гэта трывожны сімптом. Потым пачынаецца прыбіранне падлогі, латкоў, замена напаўняльніка. Абавязкова іх гладзім. Каты гэта вельмі любяць. Некаторыя нават «спаборнічаюць» за ўвагу. Многія проста самі залазяць на рукі. Вось і ўсё. Ты прыходзіш, і цябе адразу ахутваюць любоў і ласка, а ўзамен жывёлы нічога не патрабуюць. Проста будзь побач, не сыходзь.*

Пакуль Святлана расказвае, з яе твару не сыходзіць усмешка. Здаецца, яна распавядае не пра катоў, а пра любімых дзяцей. Наогул, асаблівая, светлая энергетыка ўласцівая практычна ўсім, хто працуе з жывёламі.

Алена працуе валанцёрам у ГААЖ «Суперкот» ужо каля трох гадоў. За гэты час арганізацыя «вырасла» да паўнавартаснага прыватнага прытулку для катоў, які складаецца з «Філіяла» і «Кошкінага дома». «Суперкот» — адзінае грамадскае аб'яднанне па абароне жывёл, якое заключыла дагавор з ДП «Фаўна горада». Гэта не лакальны прытулак, а суполка, якая працуе толькі з адлоўленымі альбо здадзенымі насельніцтвам жывёламі. Выключэнне робіцца толькі для траўмаваных жывёл або тых, што знаходзяцца ў цяжкім стане на вуліцы.

*— Людзі ставяцца да жывёл як да рэчы, —* кажа Алена. *— Яны лічаць, што калі кошка вырастае, перастае гуляць, пачынае каціцца (а стэрылізаваць дорага), то трэба ад яе пазбавіцца. І адносяць яе наўпрост у «Фаўну горада».*

*Для мяне кожны раз шок — ездзіць на Гурскага, 42 (па гэтым адрасе размяшчаецца ДП «Фаўна горада»). У клетках — каля сотні жывёл, — і ўсе просяцца да цябе, а некаторыя знаходзяцца ў апатыі. Цяжка выйсці адтуль без слёз на вачах ...*

*Дзяўчына-валанцёр, якая працуе ў «Фаўне горада», распавяла мне гісторыю пра жанчыну, якая прынесла туды хатнюю кошку. «Вы ж разумееце, куды прынеслі жывёліну? — Так. — А што за прычына? — Алергія». Аказалася, што жанчына брала кошку для сына, а зараз, калі ён падрос, яна стала непатрэбнай. Валанцёр спытала: «Вы ўсведамляеце, што падпісваеце зараз смяротны прысуд?» «Я нічога ў доме не вырашаю, гэта ўсё муж...». На самой жа справе гэтай жанчыне лянота жывёлай займацца. А ўсяго трэба было сфатаграфаваць кошку, напісаць пра яе пару радкоў і размясціць аб'яву ў інтэрнэце ...*

*Часта нам тэлефануюць і кажуць: «Мы тут у пад'ездзе кошку знайшлі, забярыце». Мы адказваем, што не можам узяць яе ў прытулак, таму што, па-першае, ён толькі для хатніх здаровых жывёл, а па-другое, забіраючы гэтую жывёлу, мы пазбаўляем шанцу асуджанага ў «Фаўне». У іх няма часу, кожная секунда прамаруджання падобная смерці. А ў адказ чуем: «Як, вы ж валанцёры? У вас жа прытулак! На што ідуць мае падаткі!»*

На самой справе, прытулак для жывёл існуе не на падаткі, а не прыватныя ахвяраванні. Дапамагаць жывёле — справа нятанная. Так, цяпер «Суперкот» клапоціцца аб 50-60 жывёлах. Арэнда памяшкання для іх абыходзіцца штомесяц у 500 еўра, камунальныя паслугі — у 2 мільёны беларускіх рублёў, сухі корм — у 10 мільёнаў. І гэта не лічачы спецыяльнага корму для хворых жывёл і паслуг ветэрынараў.

*— Што лепш: купіць дарагога ёркшырскага тэр'ера і выхваляцца ім перад сяброўкамі — ці дапамагчы паўсотні жывёл?* — пытаецца Алена.

На жаль, большасць выбірае першы варыянт.

Валанцёрамі можа стаць, у прынцыпе, любы паўналетні. Галоўнае — наяўнасць вольнага часу і жаданне працаваць. А вось падлеткаў бяруць неахвотна, таму што праца з жывёламі — усё ж небяспечны занятак. Не любяць і студэнтаў-«двоечнікаў».

*— Калі прыходзяць студэнты, то перш за ўсё цікавімся іх паспяховасцю, —* смяецца Святлана, *— бо калі ў іх «хвасты», то яны менш часу змогуць прысвяціць жывёлам.*

У любым выпадку, пачатковцы адны на змену не выходзяць. Іх абавязкова курыруе вопытны работнік.

У асноўным, валанцёрамі становяцца жанчыны. Мужчын жа імкнуцца перанакіраваць да сабак альбо на больш цяжкую працу. Напрыклад, дапамагчы змайстраваць жыллё для жывёлы ці адвезці яго ў ветлячэбніцу. Некаторыя дапамагаюць жывёлам тым, што складаюць іх «партфоліа», — так добраахвотнікі дапамагаюць хутчэй адшукаць сваім гадаванцам новых гаспадароў.

*— Валанцёр — неабыякавы чалавек, які не шукае выгады, а сапраўды хоча дапамагчы, —* кажа Алена. *— Калі вам неабыякавы лёс жывёл, калі не можаце прайсці міма кацяняці, кінутага на прыпынку, — вы такі ж валанцёр, як і мы.*

Нягледзячы на тое, што шчанюк Крысмас можа зараз перасоўвацца толькі на інваліднай калясцы, ён адчувае сябе шчаслівым, бо жывёла не ўсведамляе сваю інваліднасць. Для Крысмаса маюць значэнне толькі любоў і клопат людзей. А больш, напэўна, нічога...

**Тамара КОЛАС.**



**Крысмас у чаканні дапамогі.**

# ПЕРАХОДНЫ ЎЗРОСТ: НЕ ПЕРАЙСЦІ МЯЖУ...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1- й стар. «ЧЗ».)*

Мая суразмоўца лічыць, што тут вялікі ўплыў (аж да 90%) аказвае спадчыннасць. Сапраўды, бацька хлопчыка меў судзімасці. Больш за тое, відаць, пад уплывам такой спадчыннасці, ужо з шасці гадоў хлопчык пачаў сыходзіць з дому, пасля бацькі і бабуля шукалі яго цэлы дзень. Трэба было ўжо тады паспрабаваць паўплываць на хлопчыка.

*— Крыўдна, калі не ведаеш, што яшчэ можна прапанаваць падлетку,* — разводзіць рукамі Вольга Мікалаеўна. *— Усё, што можна, ужо спрабавалі. Хлопчык ездзіў у ваенна-патрыятычны лагер, яму прапаноўвалі запісацца ў школьныя гурткі і секцыі, але як аб сцяну гарохам. Ды і падлетка можна зразумець: што зробіш, калі душа не ляжыць да гэтага?*

**У Еўропе пакаранне такіх падлеткаў прадугледжвае кампенсацыю шкоды апошнімі. Як? Сваімі ўчынкамі. Працаваць, удзельнічаць у акцыях гуманітарных арганізацый — усё гэта альтэрнатыўныя віды пакаранняў. У нас такіх пакуль што няма.**

У гэтым выпадку ніяк растлумачыць дзеянні хлопчыка не атрымліваецца. Навошта красці веласіпед, калі ёсць свой? Праблема, як тлумачыць начальнік Інспекцыі па справах непаўналетніх, у ім самім:

*— Падлетак проста не можа кантраляваць сваё непераадольнае жаданне валодаць чужымі рэчамі. Яго ўжо аглядалі ўрачы з Рэспубліканскага цэнтра псіхічнага здароўя. Пэўныя адхіленні ў псіхіцы ёсць.*

Як пазбегнуць такой бяды ў сям'і? На думку маёй суразмоўцы, тут галоўнае — каб і маці, і бацька мелі аўтарытэт для дзяцей і прымалі актыўны ўдзел у іх выхаванні. А яшчэ важна спытаць хлопчыка пра тое, што яму цікава. Калі ён не можа адразу даць адказ, прапанаваць яму некалькі тэстаў. Так падлетак зможа заняцца цікавай для яго справай і не бавіць свой час у гульнях з законам.

## ДА ТУРМЫ ДАВЯЛА КАМПАНІЯ

Гісторыя другога хлопчыка магла б мець лепшы канец. Яго выхоўвала маці, якая сапраўды любіла дзіця. Працавала ў некалькіх месцах, каб забяспечыць хлопчыка ўсім неабходным. Але... падлетак пачаў красці. Чаму?

Усё проста. Так атрымалася, што ў адным класе сабраліся некалькі «складаных» падлеткаў, з якімі ён пасябраваў. Ён не быў лідарам, таму трапіў, што называецца, пад уплыў кампаніі. Ужо з дванаццаці гадоў пачаў красці ў маці, выносіў што-небудзь з дому, калі сябрам «трэба было». Выйшла так, што мы амаль што пачалі жыць за яго кошт.

Пасля падлетак пачаў сыходзіць з дому на некалькі дзён, начаваць заставаўся ў сяброў. Яго папярэджвалі і ў школе, і ў раённай інспекцыі па справах непаўналетніх не адзін раз, але хлопец не звяртаў увагі. У 14 гадоў пачаў паводзіць сябе нахабна, зневажаў настаўнікаў. Хутка з кампаніяй украў веласіпед. Была заведзена крымінальная справа, але бацькі хлопчыкаў вярнулі грошы за веласіпед, і справу закрылі.

Пазней падлетак пад уплывам кампаніі не раз парушаў закон. Былі грунтоўныя прычыны, каб накіраваць яго ў спецустанову.

— Спецустанова *— гэта не калонія для непаўналетніх,* — тлумачыць Вольга Мікалаеўна. *— Гэта ўстанова адукацыі, дзе дзеці вучацца ў пэўным рэжыме. Чаму важна было накіраваць гэтага падлетка ў спецшколу? Таму што гэта дало б магчымасць яму адысці ад шкоднай кампаніі. На жаль, суд не адправіў хлопца ў такую школу, а ў Мінску ён не мог выправіцца...*

Так атрымалася, што ўжо праз некалькі дзён пасля вынясення прыгавору, хлопчык зноў здзейсніў некалькі злачынстваў. Зараз ён арыштаваны, але, магчыма, дзякуючы амністыі зноў акажацца на волі. Але ці надоўга?

**ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ**

**Па даных, якія прадаставіла намеснік старшыні Камісіі па справах непаўналетніх Мінскага аблвыканкама Ала Паляўчук, за гэты год колькасць злачынстваў, якія ўчынілі падлеткі ў вобласці, паменшылася. Так, у 2011 годзе за першае паўгоддзе было здзейснена 303 злачынствы. У 2012 за аналагічныя 6 месяцаў — 294. Многія злачынствы здзяйсняюцца ў стане алкагольнага ап'янення. Найбольш распаўсюджанае злачынства — крадзяжы (236 з 294), таксама часта ўганяюць транспарт.**

**Найбольш дзейсным паказала сябе ранняе выяўленне непаўналетніх правапарушальнікаў. У гэтым узросце яшчэ можна неяк паўплываць на хлопцаў і дзяўчат, бо інакш яны загубяць сваё жыццё.**

## НАНЁС ШКОДУ? КАМПЕНСУЙ!

Пакуль што наша заканадаўчая сістэма ў адносінах да непаўналетніх злачынцаў або залішне лаяльная, або вельмі строгая. Пасля калоніі мала хто з іх выпраўляецца — наадварот, злачынствы паўтараюцца. Лепш, лічаць спецыялісты, прымяняць альтэрнатыўныя віды пакаранняў.

У Еўропе пакаранне такіх падлеткаў прадугледжвае кампенсацыю шкоды апошнімі. Як? Сваімі ўчынкамі. Працаваць, удзельнічаць у акцыях гуманітарных арганізацый — усё гэта альтэрнатыўныя віды пакаранняў. У нас такіх пакуль што няма.

Так ці інакш, лепш не парушаць закон. Тым больш што гэта прыводзіць да пэўных ганебных наступстваў: падлетка пачнуць саромецца сябры, бацькі, сваякі. Каму прыемна, калі твой блізкі чалавек парушае закон?..

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*З рыдлёўкай і нівелірам*

# ЯК ВУЧНІ СТАЛІ... АРХЕОЛАГАМІ

**Вучням Запольскай СШ Чэрвенскага раёна сёлета не прыйшлося доўга думаць, пра што напісаць сачыненне на тэму: «Як я правёў лета». Яны ўдзельнічалі ў самых сапраўдных... археалагічных раскопках! Нязай на спёцы гэта было і вельмі цяжка.**





Нязведанае мінулае заўсёды інтрыгуе. Хочацца самому дакрануцца да тайны, ды яшчэ калі табе 12—13 гадоў. Таму калі ў час летняга аздараўленчага лагера «Вясёлка» дзецям прапанавалі паўдзельнічаць у археалагічных раскопках, ад ахвотнікаў было не адбіцца. Удзел у іх узялі вучні 5—7 класаў. З імі працавалі супрацоўнікі аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі Зоя Харытановіч і Марыя Ткачова.

У першы дзень працы вучоных пазнаёмілі дзяцей больш падрабязна з такой цікавай навукай, як археалогія. Зрабілі прэзентацыю, расказалі аб працы свайго аддзела. Хлопцы і дзяўчаты з цікавасцю слухалі гасцей і з нецярплівасцю чакалі раскопак.

...І вось надышоў доўгачаканы момант. З раніцы і да паўдня працягваліся раскопкі. У іх удзельнічаў і я — аўтар гэтых радкоў. Асабіста пераканаўся ў тым, што, пераадолеўшы некалькі кіламетраў, школьнікі, не паддаючыся стомленасці, ішлі на пошукі новых адкрыццяў. А вось калі ў іх руках аказваліся першыя знаходкі, дык радасці юных археолагаў не было межаў. Калі сярод пяску ў раскопе заўважаеш наканечнікі стрэл, скрабок, то быццам на машыне часу пераносішся на некалькі тысячагоддзяў назад.

Да гэтага часу ў Чэрвенскім раёне ведалі некалькі месцаў з матэрыяламі каменнага веку. Аднак інфармацыя была няпоўная, яна не дазваляла дакладна вызначыць каардынаты гэтых пунктаў. Таму даследаваны каля вёскі Адынь помнік з'яўляецца першым і найбольш старажытным дакладна вядомым пасяленнем людзей каменнага веку ў раёне.

Ажыўляць мінулае — задача нялёгкая. Дзесяць падлеткаў паспрабавалі сябе ў якасці памочнікаў вучоных, навучыліся асцярожна капаць, рабіць зачыстку раскопу, знаходзіць артэфакты. Яны навучыліся правільна карыстацца не толькі рыдлёўкай, але і нівелірам.

...Чэрвенская зямля хавае ў сабе яшчэ мноства загадак. Мінскія археолагі і запольскія школьнікі ў час археалагічных раскопак толькі зазірнулі ў тайну гэтай зямлі. У хуткай будучыні яны, несумненна, змогуць перавярнуць яшчэ адну старонку ў гісторыі нашага краю. А праведзеныя разведкі — гэта ўжо першая прыступка да новых навуковых сенсацый на Чэрвеншчыне.

**Віталь ПАЛЯЧКОЎ,**
**настаўнік гісторыі**
**Запольскай**
**сярэдняй школы.**
*Чэрвенскі раён.*

**Изменения в ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ЗАСТРОЙЩИКА от *14.12.2009 г.***

**Сведения о застройщике:**
Белорусско-английское Совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (СЗАО «ЛадаГарант»). СЗАО «ЛадаГарант» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС — Холдинг» ЗАО.

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 4Н.

**Режим работы:** рабочие дни — с понедельника по пятницу, рабочие часы — с 8 ч. 30 мин. до 17 ч. 30 мин., обед — с 13 ч. 00 мин. — до 14 ч. 00 мин., выходные дни — суббота, воскресенье.

**Данные о государственной регистрации:** зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100934617.

**Сведения о проектах жилых домов,** введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:
1. 9- этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 по ул. Грушевская в г. Минске;
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 по ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки;
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 по ул. Щорса.
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 по ул. Щорса 3-я.
5. 9-этажный 4-секционный 135-квартирный жилой дом № 1 по ул. Щорса.
6. 10-этажный 7-секционный 261-квартирный жилой дом № 44 по ул. Железнодорожная.

**Цель проекта** — строительство объекта «Многоэтажные жилые дома с объектами административно-общественного назначения в квартале застройки в границах пр. Дзержинского — пр. Жукова — ул. Железнодорожная — ул. Щорса, II этап» -

жилые дома, не относящиеся к домам повышенной комфортности, включающие в себя:

жилой дом № 3 по генплану — 10-этажный, 7-секционный, 261-квартирный;

жилой дом № 2 по генплану — 9-этажный, 4-секционный, 135-квартирный;

административное здание № 2а по генплану — 8-этажное,1-секционное,

с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц, путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

**Сведения о сроках реализации**
Начало строительства — июль 2009 г.
Ввод объекта в эксплуатацию — первое полугодие 2013 г.

**У Застройщика имеются:**
- решения Мингорисполкома от 24.11.2005 г. № 2080 о предоставлении земельного участка;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» (заключения от 12.03.2008 г. № 637-5/08; от 12.03.2008 г. № 636-5/08; от 14.03.2008 г. №648-5/08; от 10.06.2008 г. №1388-5/08; от 10.06.2008 г. № 1390-5/08; от 10.06.2008 г. №1391-5/08; от 10.06.2008 г. № 1392-5/08; от 04.08.2010 г. № 873-15/10), государственную экологическую экспертизу (заключение №391 от 17.12.2007 г.);
- решения Мингорисполкома о разрешении на строительство № 2378 (I) от 09.10.2008 г., № 966 от 29.04.2010 г.
- разрешение на производство строительно-монтажных работ от 16.07.2009 г., от 16.07.2010 г., от 05.04.2011 г., от 21.04.2011 г., от 21.02.2012 г., N 2-203Ж-036/09; от 01.10.2012 г.

**Местонахождение строящегося объекта:** г. Минск, пересечение улиц Щорса — Железнодорожная в квартале застройки в границах пр. Дзержинского — пр. Жукова — ул. Железнодорожная — ул. Щорса.

**Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства:**

**Четыре административных помещения от 120 кв.м до 376 кв.м.**

**Цена одного квадратного метра в помещении административного назначения** общей площади нежилых помещений (без отделки) составляет — **1 850 долларов США** (по курсу НБРБ) **без НДС**.

**Данные о правах Застройщика на земельный участок:** земельный участок предоставлен Застройщику решением Мингорисполкома от 09.10.2008 г. №2378(I) площадью 35784 га, граничит с земельными участками г. Минска, УП «Минское отделение Белорусской железной дороги».

**Элементы благоустройства:** создаются площадки для отдыха, занятия спортом, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому — двухслойный асфальтобетон, тротуаров — мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок — спецсмесь и плитка.

**Общее имущество дольщиков** — межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, крышная котельная, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

**Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию** — первое полугодие 2013 г.

**Сведения о договорах строительного подряда:**
Договор подряда с ООО «Буд-М» №1-09 от 20.05.2009 г.

**Условия ознакомления с информацией по проекту:**
по тел. 8-017 219-78-22, VELCOM 8-029 3042784, МТС 8-033 6372565, на сайте www.lada.by либо по адресу: ул. Грушевская, 91, пом. 4Н, каб. 5.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
25 10 2012 г.

# СТАРАЖЫТНЫЯ ХІТЫ З ВЕЧАРА ДА РАНІЦЫ

У мінулыя часы, калі людзі яшчэ не мелі магнітафонаў, вясковая моладзь бавіла вольны час на вячорках. Хлопцы і дзяўчаты збіраліся ў самай вялікай у вёсцы хаце, запрашалі музыкаў... І пачыналася весялосць да ранку. Думаеце, гэтая традыцыя канчаткова сышла ў нябыт разам з распаўсюджваннем тэхнікі? Памыляецеся! Беларускі гурт «Pawa» па сутнасці займаецца тым жа, чым і вясковыя музыкі ў даўнія часы, — іграе народныя мелодыі ў клубах (але ўжо мае электрычны ўзмацняльнік, а да аўтэнтычных матываў прымешвае сучасныя музычныя фарбы). Самі музыкі свой стыль назвалі «этнатэкай» — гэта тая ж дыскатэка, але на фальклорнай аснове.

«Pawa» — вельмі малады гурт. Іх першы канцэрт адбыўся 17 лютага 2012 года ў Маскве, потым былі выступленні на сустрэчы «Дударскага клуба» ў Мінску, падчас сярэднявечных і фальклорных фэстаў... Яшчэ раней — выхад альбома, які так і называецца — «Pawa». Што ж стала штуршком для стварэння новага гурта? Бо ні для каго не сакрэт, што ў гурт «Pawa» ўваходзяць музыкі з калектыву сярэднявечнай музыкі «Testamentum Terrae» (а ён паспяхова працуе на беларускай сцэне ўжо 10 гадоў) і граюць яны тыя ж старажытныя мелодыі, толькі ў электроннай апрацоўцы.


Лідар гурта «Pawa» Юрась ПАНКЕВІЧ.

— Пэўна, галоўную ролю ўсё ж адыграла маё жаданне граць на гітары сучасную музыку. Але як я ні намагаўся, гітару так і не асвоіў. Не хапіла ці часу, ці таленту (*смяецца*). А жаданне засталося, — распавядае лідар гурта «Pawa», дудар і майстар інструментаў Юрась Панкевіч. — Вось і з'явілася думка граць на тым, на чым умееш, але граць так, каб гэта гучала сучасна. Было шмат эксперыментаў з рознымі дыджэямі, музыкамі. Мы шукалі розныя варыянты спалучэння інструментаў кшталту: дуда — бас — гітара — бубен. Але, на мой погляд, лепш за ўсё атрымліваецца з сённяшнімі музыкамі, хто і стварае адметнае гучанне гурта «Pawa».

Такім чынам, маем наступны механізм стварэння адметнага гучання этнатэкі: спачатку гурт «Testamentum Terrae» — Надзея Працько (скрыпка, вакал), Віталь Касавец (бубны), Марыся Грышанава (жалейкі, вакал), Дзмітры Барсукоў (цыстра, вакал) і Юрась Панкевіч (дуда, вакал) — іграе фальклорную мелодыю ў звыклым акустычным гучанні, а ўжо пазней яе апрацоўвае дыджэй Мікіта Седзянкоў, дадаецца гітара Сержука Шаўчэнкі, і абноўлены варыянт традыцыйнай мелодыі выконвае «Pawa». Але заўважце — выконвае ўжывую!

— Мы вельмі трапятліва ставімся да фальклорнага матэрыялу, — зазначае Юрась. — У нас часам нават узнікаюць спрэчкі, якім чынам яго лепш інтэрпрэтаваць. Напрыклад, калі ствараем новую апрацоўку танца, то, акрамя сучаснага біта, пільна сочым за фігурамі танца. Таму падчас нашай этнатэкі можна танчыць як сучасны танец, так і фальклорны варыянт, напрыклад, кракавяк ці цяцерку. Але, праўда кажучы, некаторыя саступкі мы сабе дазваляем, бо робім усё ж сучасную музыку.


Гурт «Pawa»: Сяржук ШАЎЧЭНКА, Дзмітрый БАРСУКОЎ, Марыся ГРЫШАНАВА, Юрась ПАНКЕВІЧ, Надзея ПРАЦЬКО, Віталь КАСАВЕЦ падчас выступлення ў маскоўскім клубе «Zavtra».

І варта адзначыць, вынікі працы ўжо ёсць. Поўныя залы на канцэртах. Шалёныя танцы да сёмага поту (сама неадноўчы вытанцоўвала кракавяк пад «Pawa» падчас вечарын «Дударскага клуба»). Гучанне этнатэкі нават на вяселлі ў Маскве! Магчыма, уся справа ў добрай працы прадзюсара калектыву Валерыя Шаўчэнкі? Ён, дарэчы, ужо шмат гадоў супрацоўнічае з поп-гуртом «Краскі». Ці ў адсутнасці здаровай канкурэнцыі сярод гуртоў падобнага кшталту на беларускім музычным рынку?

**Поўныя залы на канцэртах. Шалёныя танцы да сёмага поту (сама неадноўчы вытанцоўвала кракавяк пад «Pawa» падчас вечарын «Дударскага клуба»). Гучанне этнатэкі нават на вяселлі ў Маскве! Магчыма, уся справа ў добрай працы прадзюсара калектыву Валерыя Шаўчэнкі?**

— Я быў бы здзіўлены, калі б мы не спадабаліся публіцы, — задаволена адказвае Юрась на мае захопленыя каментарыі. — І гэта не мая ганарлівасць. Мы выбіраем самы папулярны і цікавы фольк-матэрыял і пераапрацоўваем яго. Гэта старажытныя хіты, таму і каверы на іх не могуць быць нецікавымі грамадству, у якім шануюць мінуўшчыну. Што да прадзюсара, то нам пашанцавала знайсці чалавека прафесійнага, ён нас шмат чаму вучыць. Мы з «Красками» працуем у розных стылях, таму тое, што падыходзіць ім, нашаму гурту — не вельмі. Адзінае, да чаго мы імкнёмся — гэта стварыць якасны, глыбокі і насычаны гук. Ствараючы танцавальную фольк-электроніку, я не знайшоў ніводнага падобнага гурта, які працуе ў гэтым жа стылі. Не тое што ў Беларусі — у свеце! І тут справа не ў рэміксах, іх шмат хто нарабіў. І нават не ў спалучэнні народных песень з бітамі. Пэўна, толькі мы і шведскі гурт «Garmarna» іграем электроніку ўжывую, з народными інструментамі. Можна яшчэ прыгадаць расійскі гурт «Иван Купала»... І калі я памыляюся, то дашліце мне на электронную скрыню спасылкі на старонкі гуртоў, якія граюць этнатэку. Будзе вельмі цікава паслухаць і павучыцца.

Цяпер музыкі распрацоўваюць матэрыял для сольных выступленняў, рыхтуюць да выдання альбом — гэта будзе пашыраная версія дыска, што пабачыў свет у 2011 годзе, і выйдзе ён у Маскве; падбіраюць мелодыі для выдання кружэлкі ў Польшчы. Спадзяюся, у іх усё атрымаецца. Думаю, што поспех гурта «Pawa» не будзе суправаджацца занападам акустычнага праекта «Testamentum Terrae», бо, якім бы моцным ні было імкненне данесці фольк да шырокага слухача, зрабіць яго запатрабаваным масавай аўдыторыяй, вытокі нашай музыкі і аснова аўтэнтыкі — у акустыцы. Да таго ж Юрась сам прызнаецца, што граць фольк яму гэтак жа цікава, як і мадэрн.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**

# «Я ЎВЕСЬ ЧАС ШУКАЮ ПРЫГОДЫ НА СВАЮ ГАЛАВУ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

***— Тандэм двух творчых людзей не перашкаджае ў жыцці?***

— Кажуць, што творчым людзям складана ўжывацца. Але гэта, хутчэй, у сітуацыях, калі кожны перацягвае коўдру на сябе. Мы дапаўняем адно аднаго: добра, што яна не спявае, а я не танцую. У нейкіх сітуацыях у нас разуменне з паўслова: мне дастаткова сказаць, што патрэбна, — і яна ажыццявіць гэта ў пастаноўцы. У сваю чаргу, яна здольна ацэньваць мае песні з пазіцыі «падабаецца — не падабаецца». Гэта карысна, калі ёсць бачанне з розных бакоў. А ў побыце... Я ніколі не думаў, што яна будзе такой цудоўнай маці. Мая жонка сама ад гэтага ў шоку. Я дапамагаю ёй па магчымасці і, як толькі ў яе з'явілася жаданне вярнуцца на працу, мы зрабілі ўсё ад абаіх залежнае, каб рэалізаваць гэтую патрэбу.

***— Вы верыце ў сяброўства паміж мужчынам і жанчынай?***

— Так, хаця існуе меркаванне, што жанчына, з якой сябруеш, — гэта тая, з кім не хочаш пераспаць. У мяне проста ёсць жанчыны-сяброўкі. І з імі я магу аб нечым параіцца, нешта абмеркаваць і проста паразмаўляць.

***— Як паводзіце сябе ў крытычных сітуацыях?***

— Лічу, што да ўсяго патрэбны філасофскі падыход. Усё, што адбываецца, мае свой час і месца. Веру ў тое, што мяне нешта аберагае. І таму, калі штосьці адбылося, магчыма, гэта дазволіць пазбегнуць нейкіх больш сур'ёзных наступстваў. Патрэбна ж неяк сябе супакойваць.

***— А якой з узнагародаў даражыце больш за ўсё?***

— Прэміі былі розныя: і вясёлыя, і пафасныя: і «Лепшы мужчынскі вакал года», і «Залатое вуха ў трубачку». Найбольш памятная — гэта «Залатая зорка» Алы Пугачовай. Па-першае, гэтая ўзнагарода была падмацавана яшчэ і рэальным складнікам. А па-другое, пасля таго, як я атрымаў яе, маё жыццё змянілася. Калі я ехаў на «Новую хвалю», то былі людзі, якія прадказвалі, што нас чакае фіяска. А потым яны рэзка змянілі свой пункт гледжання, бо мяне прызнаў аўтарытэтны чалавек.

***— Праца выкладчыка, работа на радыё і тэлебачанні — з фінансавых меркаванняў?***

— Выкладанне — дакладна не з фінансавых. Выкладчыкі ў нас не алігархі, а шкада. Хутчэй, даніна сямейнай традыцыі. У нашай сям'і гэтым займаюцца маці і брат. Таму імкнуся сумяшчаць розныя заняткі.

***— Гэтай восенню вы здзейснілі падарожжа на байках і планавалі, што яно выльецца ў праект для тэлебачання. Планы здзейсніліся?***

— Мы здзейснілі ўдалае падарожжа. Калі выязджалі з Беларусі, то ведалі толькі прыкладна, дзе хацелі б пабываць. Але мы не мелі ўяўлення, дзе будзем спыняцца і з кім кантактаваць. Усё адбывалася спантанна. Зараз праект на стадыі мантажу. Ён будзе прысвечаны падарожжам і кухням розных краін свету. Своеасаблівы варыянт рэаліці-шоу. Спадзяюся, што пасля Новага года яго можна будзе запусціць.

***— На ваш погляд, у публічнасці больш становўчага ці адмоўнага?***

— Для мяне больш плюсоў. Мне падабаецца быць на вачах ва ўсіх, каб людзі маглі ацаніць тое, што я раблю. Любое шоу, любое мерапрыемства, калі яно падабаецца аўдыторыі, сведчыць пра тое, што мы рухаемся ў правільным кірунку. У жыцці артыста самы вялікі кайф — гэта кантакт з гледачом, асабліва на энергетычным узроўні. Ты аддаеш — і да цябе вяртаецца.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з уласнага архіва Дзядзькі Вані.**



# МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАЙ ЗБРОІ: САКРЭТЫ СУЧАСНАГА МАЙСТРА

**У апошнія гады ўсё большую папулярнасць сярод моладзі набывае такі від баўлення часу, як гістарычная рэканструкцыя. Аднак назваць яго проста хобі, напэўна, было б не зусім правільна, бо для многіх гістарычная рэканструкцыя становіцца вялікай і неад'емнай часткай іх жыцця. У гістарычнай рэканструкцыі ёсць мноства напрамкаў, адзін з іх — аднаўленне сапраўднай сярэднявечнай зброі. Мікалай ЕЛЬЦАЎ (ці Барсук, як завуць яго паплечнікі па захапленні) — сапраўдны аўтарытэт у рэканструктарскіх колах, адзіны на Беларусі майстар па вырабу сапраўдных мячоў. Свой першы меч Мікалай зрабіў, калі яму было 12 гадоў. Толькі тады «сярэднявечная зброя» рабілася з ручкі ад чарпака. Ці мог той хлопчык ведаць, што ў 28 гадоў ён стане вядомым майстрам па вырабе зброі не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі? Шчыра кажучы, і выглядае Мікалай, як старажытны майстар: барада, прычоска, адпаведныя ўпрыгожанні...**



— У рэканструктарскім руху я ўжо восем гадоў, — расказаў мне майстар. — За гэты час рэканструяваў вобразы розных эпох і народаў. Зараз я аднаўляю вобраз балцкага воіна пры мінскім клубе гістарычнай рэканструкцыі «TrueVaring».

***— А чаму вырашылі спецыялізавацца менавіта на вырабе мячоў? Чаму, напрыклад, не на ювелірнай справе?***

— Пачынаў я з вырабу нажоў, драўляных рэчаў і пэўных упрыгожанняў. Але аднойчы ў мяне з'явілася жаданне зрабіць сабе меч. Сабраліся з аднаклубнікамі, каб параіцца, я паказаў ім мадэль мяча, якую хацеў зрабіць. Адразу ж з боку рэканструктараў пасыпаліся выкрыкі нашталт: «Ды ты не зробіш!», «Тут жа інкрустацыя!». І ў мяне, напэўна, спрацавала жаданне даказаць, што я на гэта здольны. Так нарадзіўся мой першы «трушны» меч, інкрустацыю да якога я зрабіў з жалеза і кавалка дроту (*інкрустацыя — упрыгожванне вырабаў узорамі і выявамі з кавалкаў металу, дрэва, керамікі, мармуру, якія накладваюцца на паверхню і адрозніваюцца ад яе па колеры альбо матэрыяле. — **Аўт**.*). Тады я адчуваў сябе сапраўдным «богам інкрустацыі». Але асабістае абагаўленне прайшло, як толькі я ўзяўся за наступны меч. І тады я зразумеў, што тэхніка вырабу мяча мала вывучана. Года паўтара таму я стаў займацца гэтай справай сур'ёзна. І стаў рабіць мячы не толькі для сябе, але і для свайго клуба.

**«Сярэдняя вага мяча эпохі вікінгаў была 1,5 кілаграма і звычайна не перавышала 1,8 кілаграма. Гэта вага тых мячоў, якія былі знойдзены...»**

***— Мікалай, прыадкрыйце таямніцу: як жа адбываецца сам працэс вырабу мяча?***

— Варта адзначыць, што вырабам клінка для мяча я не займаюся, я яго заказваю. Калі ён трапляе да мяне ў рукі, найперш гляджу, ці няма на ім дэфектаў. Калі дэфекты ёсць, то выпраўляю. Затым выбіраю тып мяча — карыстаюся каталогам археалагічных помнікаў з музеяў усяго свету. Пасля гэтага раблю дзяржальна з дрэва, а сам набор (гарда і наверша) — з металу. Потым раблю разьбу, насечку, арнамент. Заключны этап маёй працы — чыстка і паліроўка.

***— Цікава, а чым працэс вырабу сярэднявечных мячоў адрозніваецца ад вырабу сучасных?***

— Натуральна, што дакладных крыніц пра тое, як выраблялася такога кшталту зброя, няма. І зараз мы можам толькі здагадвацца, як гэта было насамрэч. Але я трымаю ў руках старажытныя мячы і па адчуваннях магу сказаць, што мая тэхніка вырабу мала чым адрозніваецца ад тагачаснай. Мяркую, што я ўсё ж такі знайшоў тэхніку гістарычнай інкрустацыі. Рызыкну сказаць, што працэс вырабу тагачаснага мяча і сучаснага амаль аднолькавы. Толькі чыстка і паліроўка цяпер робяцца на электрычных станках. І, натуральна, мячы, якія я выраблю, не з'яўляюцца халоднай зброяй. Яны выкарыстоўваюцца толькі для дапаўнення гістарычнага вобразу.

***— Існуе думка, што вага раннесярэднявечных мячоў дасягала часам 8 кілаграмаў. Ці мае права такі міф на жыццё?***

— Абапіраючыся на археалагічныя крыніцы, магу сцвярджаць, што сярэдняя вага мяча эпохі вікінгаў была 1,5 кілаграма і звычайна не перавышала 1,8 кілаграма. Гэта вага тых мячоў, якія былі знойдзены. А меркаваць і дадумваць мы можам рознае.

***— А што дае асабіста вам захапленне гэтай справай?***

— Перш за ўсё, я займаюся рэканструкцыяй для асабістага задавальнення. Адчуваю бязмежную радасць, калі трымаю ў руках гатовы меч: нарэшце скончыліся месяцы крапатлівай працы! Ёсць адчуванне, што я даў жыццё той рэчы, якая неўзабаве можа жыццё адабраць. І, вядома, калі ўлічваць той факт, што тэхніка вырабу мячоў дакладна не вядома і што сапраўдных майстроў, нават за мяжой, няшмат, то атрымліваецца, што мая праца дапамагае развіваць рэканструкцыю...

**Вікторыя ЧАПЛЕВА.**



*Сузор'е талентаў*

# БЕЛАРУСКІЯ «ДЭЛЬФІЙЦЫ»

**Паведамленнямі пра перамогі спартсменаў на Алімпійскіх ці Паралімпійскіх гульнях сёння цяжка кагосьці здзівіць. Але ці многім даводзілася чуць пра Дэльфійскія гульні? Гісторыя сучасных Дэльфійскіх гульняў прасочваецца ад антычных Піфійскіх гульняў, якія праходзілі ў старажытнагрэчаскіх Дэльфах каля падножжа гары Парнас. У сваёй праграме Піфійскія гульні аб'ядноўвалі віды мастацтваў з атлетычнымі спаборніцтвамі і гонкамі на калясніцах.**



Цыркавое трыя. Пераможцы ў намінацыі «Цырк на сцэне».

**Змагацца было зусім не проста. Так, Расійская Федэрацыя накіравала на конкурс 108 удзельнікаў. А Беларусь — усяго 8 маладых талентаў. І ўсе яны не засталіся незаўважанымі...**

Сучасныя Дэльфійскія гульні — гэта вышэйшы форум мастацтваў. У межах Дэльфійскага руху ладзяцца розныя конкурсы, фестывалі, сустрэчы, форумы рознага маштабу — ад мясцовага да міжнароднага ...У гэтым годзе VII Міжнародныя адкрытыя маладзевыя Дэльфійскія гульні дзяржаўудзельніц СНД прайшлі ў Астане пад дэвізам «Энергія маладых». У сталіцы Казахстана сабралася таленавітая моладзь з 16 краін свету: Малдовы, Расіі, Аўстрыі, Украіны, Італіі і іншых.

Беларусь была прадстаўлена ў шасці намінацыях. Трэба адзначыць, што змагацца было зусім не проста. Так, Расійская Федэрацыя накіравала на конкурс 108 удзельнікаў. А Беларусь — усяго 8 маладых талентаў. І ўсе яны не засталіся незаўважанымі...

У намінацыі «Выяўленчае мастацтва» «золата» заваявала студэнтка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Кацярына Шымановіч, у намінацыі «Класічны танец» — Валерыя Грудзіна, якая навучаецца ў Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжы. З перамогай у намінацыі «Цырк на сцэне» вярнулася дамоў цыркавое трыя ў складзе Стэфаніі Турмовіч, Станіслава Плотнікава і Мікіты Нагорнага, якія займаюцца ва ўзорнай студыі цыркавога мастацтва «Арэна» аддзела культуры Мозырскага райвыканкама.

Беларускіх юных цыркачоў запомнілі, мабыць, усе, бо зала літаральна ўзарвалася апладысментамі ў іх адрас. Прафесійнае выступленне юных дараванняў адзначылі ўсе: і журы, і ўдзельнікі, і гледачы, што бывае не часта.

*— У Астане нашы ўдзельнікі паказалі высокі вынік. Мы сур'ёзна рыхтаваліся, бо разумелі, што Дэльфійскія гульні — гэта міжнародны ўзровень,* — падзяліўся ўражаннямі ад выступлення сваіх падапечных Барыс Кузняцоў, рэжысёр-пастаноўшчык узорнай студыі цыркавога мастацтва «Арэна». — *Планавалі перамагчы ці, як мінімум, аказацца ў ліку прызёраў. Хацелася здзівіць і журы, і гледачоў. Наша мара здзейснілася, і мы дасягнулі сваёй мэты.*

Мне ж, у сваю чаргу, захацелася сустрэцца з некаторымі беларускімі конкурсантамі, каб даведацца, якія ўражанні засталіся ў іх ад удзелу ў прэстыжных спаборніцтвах.

Кожны праходзіць свой шлях у пошуках сябе. Кацярына Шымановіч расказала, што маці малявала з ёю з дзяцінства. І зараз Каця нават не ўяўляе сябе без гэтага занятку. А сур'ёзна маляваннем дзяўчына займаецца з 11 гадоў. Перамога ў конкурсе стала для яе стымулам да далейшага развіцця. Як прызналася сама Каця, найбольшае ўражанне на яе зрабіла «адкрыццё», што выяўленчае мастацтва вельмі рознае ў кожнай краіне. Цяпер яна зацікавілася выяўленчым мастацтвам Арменіі. Сярод яе мэт — атрымаць прызнанне і распачаць сваю справу. А самая галоўная мара ў дзяўчыны — падарожнічаць.

*— Вандроўкі — гэта лепшы спосаб укладвання грошай. Не столькі важна, як ты апранаешся, якімі прысмакамі харчуешся,* — кажа Каця. — *Але калі ты можаш падарожнічаць і адкрываць для сябе новыя веды, падпітвацца ўражаннямі, то гэта дазволіць развівацца, у тым ліку і ў прафесійным плане.*

З ліку тых, хто працягвае сямейную традыцыю, Сяргей Бутор, які ў намінацыі «Баян» атрымаў «бронзу». У яго сям'і ўсе музыканты. Пры гэтым і бацькі, і брат іграюць на баяне. Нават калі хлопчык вучыўся ў музычнай школе гарадскога пасёлка Поразава, то яго настаўнікам быў бацька. За плячамі Сяргея — удзел не ў адным конкурсе, але ён плануе і надалей самаўдасканальвацца, каб перамагаць. У будучым не выключае варыянтаў сольных канцэртаў. Таксама ёсць жаданне выступаць з аркестрам. А пакуль што хлопец навучаецца ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, адточвае прафесіяналізм.

Адносна сваіх вынікаў малады музыкант зазначае: «*Мы даведаліся пра ўдзел у конкурсе недзе за месяц. Рыхтаваліся ў паскораным рэжыме. Безумоўна, добра тое, што праграма заўсёды ёсць, бо часта ўдзельнічаем у розных канцэртах. Усе, хто быў на конкурсе ў маёй катэгорыі, былі прадстаўнікамі кансерваторый, акадэмій мастацтваў. Адчувалася, што падрыхтоўка ў іх сур'ёзная. Магчыма, мы маглі б і «серабро» ўзяць, але пакуль атрымалася «бронза»*».

А вось Аляксандр Данілаў здзейсніў свой прафесійны выбар... у камісійнай краме. Менавіта там хлопчык убачыў «чорную скрынку» і заявіў маці, што хоча мець такую ж. Маці спачатку адвяла сына ў харавы гурток, а потым і фартэпіяна купіла. Таму ў музыцы ў Сашы «стаж» з шасці гадоў. З Дэльфійскіх гульняў ён вярнуўся з «серабром».

*— Засталося многа станоўчых эмоцый. Для нас былі створаны добрыя ўмовы,* — прыгадвае Аляксандр. — *Калі ўзнікалі нейкія пытанні, то заўсёды, каб атрымаць параду ці дапамогу, можна было звярнуцца да валанцёраў. Лічу, што Дэльфійскія гульні — гэта перш за ўсё добры досвед. Дзякуючы ім у мяне цяпер ёсць магчымасць паступіць у кансерваторыю без іспытаў. І ёсць час падумаць і рэалізаваць нейкія іншыя задумы.*

Пакуль што навучанне ў Рэспубліканскай гімназіі-каледжы пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі займае амаль што ўвесь час, а калі здараюцца вольныя гадзіны, то хлопец любіць бавіць іх на прыродзе ці паганяць на веласіпедзе. Заглядаючы наперад, Саша бачыць сябе ў ролі выкладчыка музыкі і камернага выканаўцы.

Не застаўся незаўважаным у Астане таксама і Максім Кішчанка, які прадстаўляў Беларусь у намінацыі «Паэзія» — прэм'ернай на Дэльфійскіх гульнях. Зараз ён з'яўляецца студэнтам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і набывае спецыяльнасць «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка».

*— Я пішу вершы з дзявяці гадоў. Але разумею, што сёння складана зарабляць паэзіяй, таму і вырашыў набыць прафесію, якая дазволіць мне ў будучым мець стабільны прыбытак. Калі змагу забяспечыць сабе фінансавую незалежнасць, абавязкова буду займацца творчасцю,* — падзяліўся Максім.

Хлопец нарадзіўся ў сям'і мастакоў, але вырашыў абраць іншае творчае рэчышча. Максім піша вершы і прозу. Звяртаецца ў сваёй творчасці да розных тэм, знаходзіцца ў пастаянным пошуку. Марыць быць рэжысёрам, бо лічыць што гэта добрая магчымасць удыхнуць жыццё ў свае празаічныя творы. Мае сваіх прыхільнікаў і лічыць, што інтэрнэт — гэта прастора, якая дазваляе выказацца маладым творцам. На Дэльфійскіх гульнях ён заняў чацвёртае месца, але адзіны атрымаў дыплом «За прафесіяналізм», што дазваляе меркаваць аб яго ўзроўні.

Такое вось сузор'е беларускіх талентаў з міжнародным прызнаннем.

**Алена ДРАПКО.**

## Два многоквартирных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне № 1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

УП «КАНИМИС» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства

ЗАСТРОЙЩИК – ЧТУП «КАНИМИС».

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 3 апреля 2003 года № 505, в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100856965.

Юридический адрес: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 27, корп. 2, к. 28.

Почтовый адрес: г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, к. 1, телефон/факс +375173060802, +375173060781, режим работы: понедельник–пятница: с 9.00 до 18.00; выходные дни – суббота, воскресенье, обед с 13.00 до 14.00.

**Ранее реализованные проекты:** в настоящее время ведется строительство административного центра в квартале ул. К. Либкнехта и пер. Домашевский в г. Минске.

**Цель строительства** – исполнение инвестиционного проекта по договору № 239-Д на реализацию права проектирования и строительства объекта «Два многоквартирных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне № 1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева» от 18.05.2011 года с Минским городским исполнительным комитетом.

**Объект строительства** – два многоквартирных 16-этажных жилых дома № 6 и № 7 в микрорайоне № 1 по проекту жилой застройки в границах улиц Шаранговича – Горецкого – Рафиева.

Расположены в микрорайоне Сухарево в г. Минске.

Нормативная продолжительность строительства Объекта – 21 мес., ввод в эксплуатацию – II квартал 2013 года.

**Застройщиком получены:**

- Решение Мингорисполкома от 12 июля 2012 года № 2218 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства».

- Свидетельство (удостоверение) № 500/727-8015 о государственной регистрации создания земельного участка площадью 0,0065 га, расположенного по адресу: г. Минск, в границах ул. Шаранговича – Горецкого – Рафиева; свидетельство (удостоверение) № 500/727-8031 о государственной регистрации создания земельного участка площадью 0,6381 га, расположенного по адресу: г. Минск, в границах ул. Шаранговича – Горецкого – Рафиева.

- Экспертное заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗЫ» от 22.12.2011 года № 1009-15/11.

- Разрешение Инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску № 2-208Ж-139/11 от 12.10.2012 г.

**Договор строительного подряда** № 2/08/2012 от 01.08.2012 г. с ООО «Сетаре», № 07/08-2012 от 07.08.2012 г. с ООО «СК-12».

Жилые дома расположены в Фрунзенском районе г. Минска.

Жилой дом № 7 запроектирован с теплым чердаком, плоской кровлей, пассажирским и грузопассажирским лифтом, встроенным административно-торговым помещением. Вентиляция в квартирах – естественная. Конструктивная схема зданий – монолитный каркас с заполнением поризованным кирпичом. Наружная отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

Сведения о благоустройстве: озеленение, устройство дорожных покрытий, благоустройство прилегающей территории.

В жилом доме № 6 запроектирован автоматизированный теплопункт.

Этажность – 16. Площадь жилого здания – 6064,55 кв.м. Общая площадь квартир – 4833,5 кв.м. Общая площадь административно-торгового помещения 159,34 кв.м.

Всего в доме №7 – 77 квартир, из них для привлечения к строительству по договорам создания объектов долевого строительства дольщиков – **граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий**:

Однокомнатных общей площадью от 44,60 до 44,90 кв.м – 8 квартир. Цена 1 кв.м – 8 892 018.

Двухкомнатных общей площадью от 60,96 до 67,33 кв.м – 16 квартир. Цена 1 кв.м – 8 732 257.

Трехкомнатные общей площадью от 84,11 до 84,87 кв.м – 6 квартир. Цена 1 кв.м – 8 412 736.

Все квартиры имеют летние помещения (лоджии).

Общее имущество, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков:

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, ненесущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию зданий.

Информацию по объекту долевого строительства и условиями заключения договоров можно получить в офисе УП «КАНИМИС» с 25.10.2012 года по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 10 – 1А. Телефон/факс: 8(017)3060802, 8(017)3060781 с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни: суббота, воскресенье.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и стоимость** | **Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-70531, наименование – лесорама, площадью 282,8 кв. м, строительный объем 1 282 м.куб, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель. Фундаменты – бетонные; стены, колонны и перегородки – железобетонные панели; перекрытия и покрытия – железобетонные плиты; кровля – шиферная, полы – бетонные; имеется электроосвещение, первоначальная стоимость 106 891 000 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | Совместное белорусско-российское предприятие общество с ограниченной ответственностью «СПАСАТЕЛЬ» |
| **Местонахождение (адрес) имущества, сведения об обременениях** | Витебская область, Витебский район, Мазаловский с/с, в 2-х км южнее дер. Шалыги, 1. Обременения: 1. Ограничение (обременения) прав в использовании земель, находящихся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос (река Западная Двина), площадью 0,3312 га. 2. Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в охранных зонах линии электропередачи до 1000 В, площадью 0,0064 га. 3. Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в охранных зонах линии электропередачи свыше 1000 В, площадью 0,0251 |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **г. Витебск, ул. «Правды», 32, кабинет № 304, 21 ноября 2012 года в 11.00** |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области, 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 304, http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Трашков Игорь Сергеевич, тел./факс: (80212) 491348, (8044) 7678300. Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 491340 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в филиале № 200 Витебского областного управления ОАО СБ «Беларусбанк», код 635, УНП 300007670, **не позднее 10.00 21.11.2012.** Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

*«Банк, основанный на доверии»*

## ЗАО «Трастбанк»

220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 октября 2012 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 31 883,5 | 30 130,4 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 609,8 | 1 515,2 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 192 709,4 | 128 528,2 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 70 408,3 | 50 233,9 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 37 203,6 | 22 985,1 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 379 026,2 | 334 752,7 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 195,6 | 2 295,6 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 87 215,7 | 44 019,3 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 43 436,0 | 22 543,2 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 842 688,1 | 637 003,6 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 46 234,5 | 45 644,2 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 57 386,1 | 15 388,9 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 498 838,6 | 396 977,5 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 84 872,9 | 70 322,4 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 18 059,5 | 9 767,4 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 705 391,6 | 538 100,4 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 71 612,3 | 48 785,7 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 9 719,8 | 9 719,8 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 48 117,3 | 32 176,1 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 7 847,1 | 8 221,6 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 137 296,5 | 98 903,2 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 842 688,1 | 637 003,6 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
## за январь – сентябрь 2012 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 50 101,6 | 34 959,5 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 47 280,5 | 30 078,5 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 2 821,1 | 4 881,0 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 27 676,6 | 31 419,7 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 2 473,0 | 2 592,4 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 25 203,6 | 28 827,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 2 239,9 | 83,1 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 9 009,6 | 5 398,1 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | (473,3) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (6 040,6) | 21 184,3 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 9 451,2 | 15 523,9 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 38 597,3 | 22 661,6 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 6 028,5 | 3 133,0 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 10 140,2 | 7 261,2 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 1 625,9 | 1 532,1 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 8 514,3 | 5 729,1 |

**Председатель Правления ЗАО «Трастбанк»** **В.М. Саксон**

**Главный бухгалтер** **Н.В. Бродик**

**«17» октября 2012 г.**

УНП 100789114. Лиц. № 14 от 13.11.2008 г. НБ РБ

Утерянный полис по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП 2РН серии БА № 0304160 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным.**

Утерянные представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланки страховых полисов по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств–членов системы «Зеленая карта» серии BY/01 №№ 5516537-5516540 **считать недействительными.** УНП 101883943

## Извещение о проведении 26 ноября 2012 г. аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для индивидуального жилищного строительства в Чернавчицком сельском Совете Брестского района Брестской области

| № лота | Предмет аукциона | Площадь, га | Начальная стоимость земельного участка, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок в аг. Чернавчицы, ул. Южная, 15 121284608601000832 | 0,1500 | 31 542 825 | 3 154 282 | строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома |
| 2 | Земельный участок в аг. Чернавчицы, ул. Южная, 16 121284608601000833 | 0,1501 | 31 563 853 | 3 156 385 | строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома |

По улице Южной в аг. Чернавчицы централизовано проходят сети газоснабжения, водоснабжения, водоотведения.

**Аукцион будет проводиться 26.11.2012 в 11.00 по адресу: Брестский район, аг. Чернавчицы, ул. Сикорского, 22 (здание сельисполкома).**

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Чернавчицкого сельисполкома № 3604010400027 в филиале 126 АСБ «Беларусбанк» код 246 УНП 200036594, код платежа 4901 задатка в размере 10% от начальной цены земельного участка, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Чернавчицы, ул. Сикорского, 22 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявления 20 ноября 2012 года.**

## ООО «Арбитр», управляющий по делу о банкротстве – организатор торгов, СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ по продаже имущества Волковысского ОАО «ПМК-Строй»:

| № лота | Наименование лота | Начальная цена продажи лота | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 2 | Пилорама (3А1/к) S 115,4 м$^2$ | 78 626 700 р. | 3 931 335 р. | 3 931 335 р. |
| 3 | Одноэтажное кирпичное здание бытовка-склад, S 119,1 м$^2$ | 125 428 500 р. | 6 271 425 р. | 6 271 425 р. |
| 4 | Прицеп ОДАЗ 935 1989 г. | 2 558 887 р. | 127 944 р. | 127 944 р. |

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

**Торги состоятся 02 ноября 2012 года в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.**

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: Волковысское ОАО «ПМК-Строй», р/с 3012202200013 в ОАО «Белагропромбанк» отделение в г. Волковыске, код 152101446, УНП 500042773.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления **до 11.00 01.11.2012** по адресу: 230001, г. Гродно-1, а/я 27 или по факсу 8(0152) 526859.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. В соответствии с п. 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Настоящее объявление содержит лишь общие характеристики предмета торгов и условий его реализации. Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8(029)7831160, тел./факс 8(0152)526859. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Октябрьская, д. 151.

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «Торгмаш»

| Номер лота | ЛОТ № 1 |
|---|---|
| Наименование объекта | 1. Изолированное помещение (инв. № 110/D-2759178), общ. пл. 560,4 м² – помещение неустановленного назначения, наименование – станция очистки химически загрязненных стоков.<br>2. Изолированное помещение (инв. № 110/D-2759176), общ. пл. 4032,6 м² – производственное помещение, наименование – гальваническое отделение производственного корпуса № 2 |
| Местонахождение объекта | Брестская обл., г. Барановичи, ул. Чернышевского, 61-3 и 61-2 |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Торгмаш» |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление |
| Начальная цена продажи, руб., без НДС | 6 164 668 610 |
| Размер задатка, руб. | 616 466 861 |
| Право на земельный участок | Конкретные границы земельного учатска определяются после проведения аукциона с его победителем по соглашению сторон в зависимости от целей использования объекта аукциона |
| Условия продажи | Продажа осуществляется единым лотом |
| Тип и характеристика объекта | 1. Изолированное помещение (инв. № 110/D-2759178), общ. пл. 560,4 м² – год постройки 1986, объем 27217 м³, стены – панельные, керамзитные и из ячеистого бетона, перегородки – панельные, кирпичные, перекрытия – ж/б, крыша из рулонных материалов, полы – бетонные, проемы – оконные ПВХ стеклопакеты, дверные – металлические ворота, деревянные щитовые, внутрення отделка – штукатурка, окраска, электроснабжение, вентиляция.<br>2. Изолированное помещение (инв. № 110/D-2759176), общ. пл. 4032,6 м² – год постройки 1986, объем 3576 м³, стены – крупнопанельные, керамзитные и из ячеистого бетона, перегородки – панельные, кирпичные, перекрытия – ж/б, полы – бетонные, проемы – оконные ПВХ стеклопакеты, дверные – металлические ворота, внутрення отделка – штукатурка, окраска, электроснабжение, вентиляция, грузовые лифты |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Условия оплаты | Оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618010 руб. РБ в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится <u>15 ноября 2012 г. в 11.00</u>**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.**
**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация».**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**<u>Последний день приема заявлений</u> – 14 ноября 2012 г. до 17.00.**
**Контактный тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

## ОТКАЗ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

УП «Минский городской центр недвижимости» извещает об отказе от проведения 05 ноября 2012 года торгов по продаже имущества ОАО «Белметалл» (административные помещения №№ 16, 17, 18, 19, 20, 24, 32, 33, 34, 35, 36, 37, 38, расположенные на ул. Казинца, 2 в Минске). Извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 04.10.2012.

**Телефон для справок: (017) 327 48 36.**

## Извещение о проведении повторных аукционных торгов по продаже объектов недвижимости ОАО «Кузлитмаш»

| № лота | 1 |
|---|---|
| Характеристика объекта | <u>Изолированное помещение</u> с инв. № 130/D-41717 площадью 4425,5 кв.м **(помещение в административно-бытовом корпусе)** |
| Местонахождение объекта | Брестская обл., г. Пинск, ул. Техническая, 6, на земельном участке с кадастровым номером 144500000005000046 |
| Продавец | ОАО «Кузлитмаш» |
| Начальная цена продажи с НДС, руб. | **2 874 222 212*** |
| Сумма задатка, руб. | 287 420 000 |
| **Организатор аукционных торгов КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»** | |
| ***– Начальная цена снижена на 20%** | |

**ПРИМЕЧАНИЕ**: для участия в аукционе необходимо в адрес организатора аукциона подать заявление, подписать соглашение с КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» и представить: ***заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка***; ***юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем*** – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; ***иностранным юридическим лицом*** – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; ***иностранным гражданином или лицом без гражданства*** – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; ***представителем заявителя*** (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код банка 252, УНП 290433924.**

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Гражданским кодексом Республики Беларусь и условиями, содержащимися в договоре поручения по продаже на аукционе объектов недвижимости.

**Договор купли-продажи объекта с победителем аукциона заключается Продавцом в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукционных торгов и подписания протокола о результатах аукциона.**

**Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов оплатить организатору аукциона сумму в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона.**

**Аукцион состоится <u>9 ноября 2012 г.</u> в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 25.10.12 г. до 17.30 08.11.12 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.)**
**по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46.**
**Контактные телефоны: 23 81 92, 23 18 13, 23 45 56.**
**Сайт: www.bgcn.by и www.city.brest.by**

**ОАО «Экран» г. Борисов**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ вертикально-сверлильного станка 2Н118

**1976 года выпуска (начальная цена 2 984 252 руб. без НДС)**

**и двух печей сушильных АРСМ 3.009**

**1982 года выпуска (начальная цена 7 832 000 руб. без НДС за 1 ед.).**

Задаток в размере 10% перечисляется на р/с 3012014600010 «Франсабанк» ОАО г. Минск, код 266, УНП 600417525. Продажа осуществляется без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Договор купли-продажи заключается в течение 10 дней после проведения аукциона. Условия оплаты в течение 30 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Аукцион состоится **30 ноября 2012 г. в 10.30** по адресу: г. Борисов, ул. Полка Нормандия–Неман, 167. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 29.11.2012 до 16.00** по адресу: г. Борисов, ул. Полка Нормандия–Неман, 167, отдел главного технолога.

**Контактный телефон: (0177) 70 61 29.**

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже объектов недвижимости ОАО «Кузлитмаш»

| № лота | 1 |
|---|---|
| Характеристика объекта | <u>Капитальные строения</u>: с инв. № 130/С-25600 (**здание проходной**) пл. 9,6 кв.м, с инв. № 130/С-25598 (**здание сварочного участка**) пл. 97,8 кв.м, с инв. № 130/С-25599 (**здание фрезерного участка**) пл. 474,4 кв.м, с инв. № 130/С-25602 (**здание токарного участка**) пл. 516,7 кв.м, с инв. № 130/С-25603 (**здание административно-хозяйственное**) пл. 314,8 кв.м, с инв. № 130/С-38535 (**склад металла**) пл. 49,3 кв.м, с инв. № 130/С-38222 (**здание трансформаторной подстанции**) пл. 39,1 кв.м, с инв. № 130/С-38220 (**здание складского помещения**) пл. 88,5 кв.м (в.т.ч. пожарный водоем 705,0 кв.м, труба вытяжная, ограждение металлическое – сетка, забор деревянный, ж/б колодец, пешеходная дорожка 334,0 кв.м и 78,0 кв.м), **зеленые насаждения** 148 шт. |
| Местонахождение объекта | Брестская обл., Пинский р-н, г.п. Логишин, ул. Томилова, 1 на земельном участке с кадастровым номером 125455500001000142 |
| Продавец | ОАО «Кузлитмаш» |
| Начальная цена продажи с НДС, руб. | **2 684 883 952** |
| Сумма задатка, руб. | **268 480 000** |
| **Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»** | |

**ПРИМЕЧАНИЕ**: для участия в аукционе необходимо в адрес организатора аукциона подать заявление, подписать соглашение с КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» и представить: ***заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка***; ***юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем*** – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; ***иностранным юридическим лицом*** – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; ***иностранным гражданином или лицом без гражданства*** – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; ***представителем заявителя*** (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

**Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код банка 252, УНП 290433924.**

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Гражданским кодексом Республики Беларусь и условиями, содержащимися в договоре поручения по продаже на аукционе объектов недвижимости.

**Договор купли-продажи объекта с победителем аукциона заключается Продавцом в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукционных торгов и подписания протокола о результатах аукциона.**

**Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов оплатить организатору аукциона сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона.**

**Аукцион состоится <u>26 ноября 2012 г.</u> в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются**
**с 8.30 25.10.12 г. до 17.30 23.11.12 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46.**
**Контактные телефоны: 23 81 92, 23 18 13, 23 45 56.**
**Сайт: www.bgcn.by и www.city.brest.by**

## Извещение об открытом аукционе по продаже права аренды изолированных помещений и зданий в г. Гродно

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь (кв.м) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Условия аукциона | Характеристика объекта и условия использования |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Поповича, 5 | 88,9 | 1 205 000 | 1 205 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в здании гостиницы |
| 2. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Поповича, 5 | 28,1 | 380 000 | 380 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в здании гостиницы |
| 3. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Пролетарская, 52 | 29,4 | 400 000 | 400 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в двухэтажном здании |
| 4. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Академическая, 14 | 12,2 | 165 000 | 165 000 | Аукцион без условий | 2-й этаж в двухэтажном здании |
| 5. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Комарова, 6 | 14,2 | 195 000 | 195 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в здании общежития |
| 6. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Советская, 5-6 | 51,4 | 695 000 | 695 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в двухэтажном здании |
| 7. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Советская, 6-12 | 52,3 | 710 000 | 710 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в двухэтажном здании |
| 8. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Троицкая, 37-2 | 35,7 | 485 000 | 485 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в одноэтажном здании |
| 9. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Суворова, 23-61А | 24,6 | 335 000 | 335 000 | Аукцион без условий | 1-й этаж в жилом доме |
| 10. | Право аренды помещения на 3 года | пр-т Клецкова, 106 | 42,0 | 570 000 | 570 000 | Аукцион с условием* | Мансардный этаж в жилом доме |
| 11. | Право аренды помещения на 3 года | ул. Ленина, 17-4 | 68,7 | 930 000 | 930 000 | Аукцион с условием** | 1-й этаж в одноэтажном здании |
| 12. | Право аренды здания на 3 года | ул.Грандичская, 30А | 25,2 | 345 000 | 345 000 | Аукцион без условий | Одноэтажное здание |
| 13. | Право аренды здания на 3 года | ул. О. Соломовой (автостоянка) | 27,6 | 375 000 | 375 000 | Аукцион без условий | Двухэтажное здание |
| 14. | Право аренды здания на 3 года | ул. Горновых, 29 | 45,0 | 610 000 | 610 000 | Аукцион с условием*** | Одноэтажное здание |
| 15. | Право аренды здания на 3 года | ул. Победы, 4/59 | 363,8 | 4 915 000 | 4 915 000 | Аукцион с условием*** | Одноэтажное здание |
| 16. | Право аренды здания на 3 года | ур. Пышки, 7 | 172,6 | 2 331 000 | 2 331 000 | Аукцион без условий | Одноэтажное здание |

*Использование объекта по согласованию с МЧС и ГУ «ГЗЦГиЭ», ** принимать участие в долевом финансировании ремонта здания и прилегающей территории, *** досрочное расторжение договора аренды в случае сноса объекта.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за право заключения договора аренды осуществляется по безналичному расчету в течение 3-х рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

3) Победитель аукциона в течение 3-х рабочих дней с момента подписания протокола аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

**<u>Аукцион состоится 26 ноября 2012 года в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1</u>**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. № 61, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. **<u>Заявления принимаются с 25 октября по 20 ноября 2012 г.</u>** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## Извещение об открытом аукционе по продаже объектов недвижимости

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена (руб.) с учетом НДС | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Капитальное строение, инв. № 400/С-76345 (здание свинарника) | Гродненский р-н, г.п. Сопоцкин ул. Яна Павла II, 70А | 327 091 200 | 32 700 000 | Продажа в собственность. | Одноэтажное кирпичное здание общей площадью 404,3 кв.м, площадь застройки 472 кв.м, год постройки 1984, забор, ворота – 2 шт, колодец. Площадь земельного участка – 0,2036 га |
| 2. | Капитальное строение, инв. № 400/С-35598 (здание котельной с подстанцией, трубой, сетями и оборудованием) | г. Гродно, ул. Суворова, 127 | 1 309 955 625 | 130 000 000 | Продажа в собственность. Использование под объект производственно-коммунального назначения | 4-этажное кирпичное здание общей площадью 1444,3 кв.м, площадь застройки 906 кв.м, год постройки 1963. Площадь земельного участка 0,2582 га |
| 3. | Капитальное строение, инв. № 400/С-35593 (здание насосной с мазутохранилищем и оборудованием) | г. Гродно, ул. Суворова, 127 | 343 377 600 | 34 000 000 | Продажа в собственность. Использование под объект производственно-коммунального назначения | Одноэтажное здание с подвалом общей площадью 172,4 кв.м, площадь застройки 107 кв.м, год постройки 1968, мазутохранилище – две емкости по 1000 т. Площадь земельного участка 0,2582 га |
| 4. | Капитальное строение, инв. № 400/С-76252 (труба дымовая) | г. Гродно, ул. Суворова, 127 | 549 996 480 | 54 000 000 | Продажа в собственность. Использование под объект производственно-коммунального назначения | Площадь застройки 44 кв.м, высота 75 м, год постройки 1963. Площадь земельного участка 0,0194 га |

Лоты продаются по договору поручения. Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

3) Победитель аукциона по лоту № 1 обязан в течение 10 календарных дней с момента подписания протокола аукциона заключить договор купли-продажи.

4) Оплата за лот № 1 производится в течение 15 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.

**<u>Аукцион состоится 26 ноября 2012 года в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1</u>**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. № 61 в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. **<u>Заявления принимаются с 25 октября по 20 ноября 2012 г.</u>** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

## Наwwwіны :)

*Тое, што з дапамогай інтэрнэту можна лёгка стаць папулярным, калі для каго і сакрэт, то сакрэт палішынеля. Іншая справа, што нехта становіцца каліфам на гадзіну, а нехта — новым героем для цэлага пакалення, дый адценні ў віртуальнай славы зусім розныя. У сённяшнім аглядзе мы вырашылі прайсціся па шырокім спектры інтэрнэт-сенсацый, ад чорнага да белага.*

### ЧУПАКАБРА НЕ ПРЫЖЫЛАСЯ

Яшчэ два тыдні таму інфармацыя пра невядомую жахлівую істоту, якая высмоктвае кроў у дробнай свойскай жывёлы і птушкі і трымае ў страху ўвесь Старобін, мела эфект бомбы. Пра стварэнне, з лёгкай рукі калег ахрышчанае чупакабрай (драпежнік—герой міфаў Паўднёвай Амерыкі), не гаварыў і не пісаў толькі лянівы.

Але «засады» з фота- і відэакамерамі вынікаў не далі, паляўнічыя і заолагі па звычках аднадушна апазналі ў драпежніку куніцу і/ці тхара. Таму неўзабаве сенсацыя, не атрымаўшы, у адрозненне ад «крывасмокаў», падпіткі, сышла на нуль. А вось праблема неабароненасці вясковых падворкаў ад тхароў або рысяў, і тым больш двухногіх зламыснікаў, усё ж засталася. Нягледзячы на ўсе захады. Хоць ты для вырашэння пытання і сапраўды атрад чупакабраў на службу набірай...

Зрэшты, знайшліся тыя, хто ад гэтай сітуацыі выйграў. Так, адна са сталічных турфірмаў у якасці рэкламнага ходу запрашае ахвотных у навагоднія туры з удзелам чупакабры. Праўда, падкрэслівае, што гэты персанаж фантастычны і, безумоўна, добры. Эх, не бачылі гэтай рэкламы ў Старобіне!

### «УКІД» ЗАЛІЧАНЫ

Літаральна днямі ў расійскіх інтэрнэт-выданнях з'явілася інфармацыя: з-за нейкіх пабочных прадметаў прыпынілася праца славацкага і венгерскага апаратаў нафтаправода «Дружба». Пікантнасць навіны заключалася ў тым, што, паводле інфармацыі «з дасведчаных крыніц», пабочнымі прадметамі аказаліся... прэзерватывы і дзіцячыя соскі. Прычым, як высветлілася, здарыўся інцыдэнт яшчэ на пачатку кастрычніка, але шуму не падымалі — з-за таго як быццам, што неабходны рамонт быў здзейснены хутка і не паўплываў на апарацыйныя паказчыкі.

Тады ў чым справа? Як высветлілася, постфактум прадстаўнікі расійскай кампаніі «Транснафта» паведамілі, што на тэрыторыі Расіі, Беларусі і Украіны аналагічных паломак не адбылося, але «можна выказаць здагадку, што гэтыя ўкіды былі здзейснены наўмысна і адбыліся на тэрыторыі адной з краін-транзіцёраў» — чытай, Украіны або Беларусі. Намёк атрымаўся больш чым празрысты. Са свайго боку, адмысловцы «Гомельтранснафты» пракаментавалі навіну як «поўную лухту»: маўляў, тэхнічна немагчыма зрабіць так, каб у нафтаправод трапілі пабочныя прадметы, а ўсякія незаконныя «ўрэзкі» ў нафтаправод апаратыўна ліквідуюцца кантралюючымі службамі.

Я, прызнаюся, з тэхнікай кантакту на «вы» і шэптам. Але нават маёй наіўнасці не хапае, каб паверыць, што буйнейшы ў свеце нафтаправод агульнадаступны, як сажалка ў гарадскім парку: прыходзіць, хто хоча, корміць качак і кідае бутэлькі ці, прабачце, прэзерватывы... Цікава, каму ж тады патрэбны «ўкід» — гумовы і інфармацыйны?

### ДАВАЙ ЗА ІХ, ДАВАЙ — ЗА НАС

Толькі адшумела палеміка вакол незвычайнага эксперыменту рэжысёра з Мінска Кірыла Нонга (22-гадовы хлопец усяго за 2,5 тысячы долараў зняў на ўласную камеру сапраўдны галівудскі камедыйны баявік і выклаў яго ў агульны доступ у сеціва), як у Байнэта з'явіўся новы герой: беларус па паходжанні Дзмітрый Шолахаў перамог у амерыканскім тэлепраекце «Подыум», дзе спаборнічаюць дызайнеры вопраткі, і атрымаў у якасці прызу 100 тысяч долараў на запуск уласнай лініі адзення.

Байнэт загаманіў, а месцамі нават завіраваў. Аднак, што адметна, толькі частка (заўважым — меншая) публікацый і каментарыяў носяць віншавальна-пазітыўны характар. Мноства інтэрнэт-карыстальнікаў абмяркоўвае, што тут увогуле такога надзвычайнага, папракаюць мадэльера ў адсутнасці патрыятызму, спрачаюцца, ці можна ўвогуле лічыць як першага, так і другога героя беларусамі, альбо няма чаго нам прымазвацца да поспеху «грамадзян свету».

Не хачу, каб мяне лічылі груганом, але ўпэўнена: пакуль наша агульная псіхалогія застанецца местачковай, дзе першым жаданнем у дачыненні да чужога поспеху будзе памкненне знайсці чорнае ў белым, пакуль мы будзем «прымазвацца» да індывідуальных перамог і адхрышчвацца ад агульных памылак — выхадцы з Беларусі так і будуць імкнуцца самарэалізавацца ў іншых, аддаленых ад роднай краіны мясцінах. І наадварот, уменне шчыра парадавацца за іншага чалавека — гэта па-еўрапейску. Так што, давайце «хварэць» за нашых, дзе б яны ні дасягалі поспехаў!

**Дзяжурыла па сеціве Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# УВАХОД — ВОЛЬНЫ

**У рэдакцыі часопіса «Маладосць» кожны тыдзень ладзяцца сустрэчы для падлеткаў.**

Лепшы спосаб абудзіць тых, хто яшчэ не ведае пра заснаванне на базе часопіса «Бярозка» брэнда «Бярозка(tm)», — зрабіць некалькі замалёвак «з натуры», неўпрыкмет націснуўшы на кнопку «Запіс».

— Гэты верш не падабаецца нікому, акрамя мяне.

— Пачытай, калі ласка.

У цішыні рэдакцыйнага пакоя, які яшчэ памятае словы класікаў і які дзве гадзіны таму слухаў засяроджанае маўчанне рэдактараў-мэтраў, гучаць радкі «пачатковай» творчасці. Упэўнена ці не вельмі — няма вялікай розніцы. Галоўнае слова — «гучаць».

— Тут ёсць рускія словы. Адчуванне такое, быццам ты думала па-рускай, а потым проста паленавалася падабраць беларускія адпаведнікі. Гэта не вельмі добра, на маю думку. Хто яшчэ хоча выказацца?

— Я скажу ў абарону, бо ведаю шмат розных людзей, якія пішуць на трасянцы. І нават песні так спяваюць: слова рускае — слова беларускае. Мне падабаецца. Не ведаю, чаму, але лічу, што часам такі ход дапушчальны. Гэта ж адлюстроўвае нашу сучаснасць. Ну хто ў нас зараз дасканала ведае беларускую мову? Прафесары толькі. Журналісты і літаратары — дакладна не ўсе.

— А мне мінулай вясной падарылі кнігу — зборнік твораў з нейкага конкурсу. Якога — я дакладна не памятаю, але наступным разам кніжку прынясу. Дык вось там ёсць творы не толькі на трасянцы, але і з ужываннем лаянкі і нават мацюкоў. Мая маці ўзяла гэту кнігу пачытаць — і была ў шоку. З аднаго боку, смешна і весела. З іншага, ацэньваць гэта як мастацтва наўрад ці магчыма. У якім конкурсе гэта магло ўдзельнічаць? Дзіўна...

Як юныя паэты ставяцца да творчасці сваіх равеснікаў? Што моладзь думае пра творцаў з імёнамі? Як існаваць у крэатыўнай прасторы, не падпарадкоўваючыся стэрэатыпам і адначасова не знішчаючы «добрае вечнае»? На гэтыя пытанні можна шукаць адказы ў творчай майстэрні часопіса «Бярозка», які часова (тут галоўнае слова «часова») прыхінуўся да вокладкі «Маладосці».

**Наш кар.**

***«Бярозка(tm)»** — творчая майстэрня для будучых класікаў — працуе кожны панядзелак з сямі вечара... і да апошняга рукапісу.*

***Адрас: Незалежнасці, 39, рэдакцыя.***

## SEX-БАЛЯСЫ

# УСЁ — УПЕРШЫНЮ І НАНОЎ

**Як гаварыў адзін маладзён, герой рэкламнага роліка: «Я яшчэ першакурсніц не бачыў!» А вось вялікі горад ужо другі месяц запар мае гонар назіраць за чарговай хваляй моладзі — першакурснікамі і першакурсніцамі. Якая яна ім, сталіца, трэба спытаць у іх саміх. А вось як выглядаюць новаспечаныя студэнты ў вачах гараджан, пра гэта мы і пагаворым...**



Першакурснікі пакуль яшчэ нават вонкава па шэрагу прыкмет вельмі вылучаюцца з агульнай людской плыні. Што па адным, што ў кампаніі. Дарэчы, менавіта спосаб перасоўвацца па горадзе групамі найперш выдае прыезджых маладых людзей. Не заўважалі? На лекцыі, паміж лекцыямі і пасля іх — яны пакуль разам. Калі нехта з кампаніі вырашыў купіць які пончык ці блінчык, гэта за ім абавязкова зробяць усе астатнія. Калі вырашаць папіць пакуль яшчэ колы, спрайту, пачаставацца чыпсамі, у краму яны не накіруюць затарвацца аднаго-двух чалавек, як тое зрабілі б старшакурснікі, а зойдуць усёй вялікай камандай і кожны адстаіць чаргу і асабіста расплаціцца. А той, хто ўжо набыў патрэбнае, на ганку будзе чакаць іншых, пакуль не выйдзе апошні таварыш.

**Пакуль яшчэ ўсе толькі прыглядаюцца адно да аднаго, пачынаюць сябраваць у кампаніі. Хаджэнні, «трымаючыся за ручкі» і замілаваныя, улюбёныя позіркі — вочы ў вочы — пачнуцца пазней, недзе з другога курса.**

У грамадскім транспарце іх таксама лёгка вылічыць. Або па тым, як яны паспешліва саступаюць месца жанчынам, пажылым і дзецям. Або па тым, як, пакуль яшчэ не прызвычаіўшыся, папросту спытаць чалавека наперадзе, ці выходзіць ён на наступным прыпынку, неяк нязграбна, моўчкі, імкнуцца працiснуцца да дзвярэй. Пра шырока расплюшчаныя вочы і гаварыць не даводзіцца — усё яшчэ так цікава і так нязвыкла!

...Першакурснікаў лёгка можна вызначыць і па адзенні. Не, не крыўдуйце, малады людзі, не пужайцеся, бацькі! Усё добра. Проста, калі гаварыць пра хлопцаў, усе яны апрануты ў аднолькавыя чорна-сіне-карычневыя курткі, джынсы, кашулі. Калі большая частка вагона ў метро выглядае падобным чынам, высновы зрабіць не цяжка. Але памятайце мае словы: пройдзе зусім няшмат часу, і бацькі, і самі студэнты не пазнаюць сябе! З'явіцца жаданне апрануць нешта адмысловае, каб вылучацца сярод іншых, знайсці нейкі свой стыль.

А вось дзяўчаты-першакурсніцы якраз і вылучаюцца сваім адзеннем. Кожная прыберагла самае лепшае, самае моднае (у яе разуменні) для пачатку сталічнага жыцця. Як правіла, гэта вельмі кароценькая сукенка (пажадана — з дэкальтэ) пад высокія абцасы (пры ўмове пахаладання — лёгкі і такі ж кароценькі плашчык) або зноў жа кароткія шорты на калготкі, нават пад чорныя, і такія абавязковыя абцасы... І такіх «шорцікаў» часам едзе ўсё ў тым жа вагоне побач — даволі шмат...

Што яшчэ для першакурснікаў і першакурсніц сталіца? Гэта — нязграбныя спробы выглядаць сталымі, дасведчанымі... Адзін маладзён у аўтобусе кажа другому: «Ты ведаеш, што «Ферары» разганяецца да ста кіламетраў у гадзіну за 2,3 секунды». Той адказвае: «Так, толькі я не вельмі разбіраюся ў «Ферары». Першы адразу: «Калі шчыра, я ўвогуле нічога не разумею ў «Ферары»...

Падаецца, што сярод тых, хто неяк дэманстратыўна прыкурвае цыгарэту на вуліцы, больш дзяўчат, чым хлопцаў. Гледзячы, як неспрактыкавана такая «зялёнка» (прабач, мілая, не стрымаўся!) трымае яе, як запальнічка выслізвае з рук, хочацца толькі паківаць галавой і спытаць: «А мамка хоць ведае?»

Сталіца — гэта першы, падавалася б, цнатлівы падман... У перапоўненым аўтобусе прасоўваецца кантралёр. Маладзенькая дзяўчына тут жа пачынае адлічваць грошы на талончык. Побач большасць пасажыраў маюць праязныя: хто паказвае іх, але большасць проста коратка паведамляюць пра гэта. І дзяўчо таксама, кінуўшы праз плячо: «Праязны», — паспешліва запіхвае купюры ў сумачку. І праз секунду — «стрэл» вачыма ў твой бок: ці заўважыў што пасажыр побач?..

Гэта — першыя для многіх «даросылыя» знаёмствы з равеснікамі... Пакуль яшчэ ўсе толькі прыглядаюцца адно да аднаго, пачынаюць сябраваць у кампаніі. Хаджэнні, «трымаючыся за ручкі» і замілаваныя, улюбёныя позіркі — вочы ў вочы — пачнуцца пазней, недзе з другога курса. Хіба толькі старшакурснікі, нібы тыя ваўкі вакол мірнага статка, «кружаць» вакол пакуль палахлівых дзяўчат, прыглядаючы сабе сяброўку...

Гэта (напачатку) — згуртаванасць мясцовых супраць «панаехаўшых», якая потым, як правіла, перарасце ў нармальныя чалавечыя стасункі і сяброўства... Гэта — агонь у вачах, жаданне перавярнуць горы і ўсім усё на свеце даказаць. Асабліва да першай сесіі...

...Нехта запытае: а што з усяго вышэйсказанага мае дачыненне да нашай рубрыкі? Усё! Думаю, у гэтых нататках пазнаюць сябе колішнія першакурснікі і пяці-, і дзесяці-, і дваццаціагадовай даўніны. Змяняюцца нейкія знешнія атрыбуты, але, па сутнасці, маладосць застаецца нязменнай: прагнай і цікаўнай да жыцця, поўнай сіл і энергіі, няўрымслівай і часам непасрэднай. І ва ўсім гэтым — столькі жыцця, драйву і, зразумела ж, сэксу!!!. А таму, прыгадаўшы словы аднаго ўніверсітэцкай выкладчыцы, хочацца напрыканцы некаторых іх перафразаваць: вы думаеце, што ўвесь час будзеце такімі маладымі і прыгожымі?!. Нашы навучальныя ўстановы штогод выпускаюць тысячы даўганогіх прыгажунь і не менш прывабных красунчыкаў! Таму — не расслабляйцеся!

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 26.911.
Нумар падпісаны ў 19.30 24.10.2012 г.

**Крынічка**

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27.

№ 30 (452)

# ВІНАГРАДНІК У ЛІСТАПАДЗЕ



Лістапад — час завяршальных работ на вінаградніку. Да гэтага часу кусты гатункаў, якія трэба ўкрыць, павінны быць цалкам падрыхтаваны. Праводзяць гэтыя работы ўжо пры першых прыкметах надыходу ўстойлівых адмоўных тэмператур. Не варта спяшацца хаваць вінаград пры цёплым надвор'і, асабліва поліэтыленавай плёнкай. У гэты перыяд у лазе ідуць працэсы пераўтварэння (рэдуцыравання) нізкамалекулярных злучэнняў цукраў у вялікамалекулярныя крухмалы. Вязкасць (шчыльнасць) клетачнага соку ўзрастае прапарцыйна колькасці сінтэзаванага да гэтага часу кустом крухмалу. У выніку такіхператварэнняў цукру ў крухмал марозаўстойлівасць лазы павялічваецца (яна гартуецца) і наўпрост залежыць ад утрымання крухмалу ў ёй. Працэс загартоўкі лазы працякае паступова і найбольш інтэнсіўна адбываецца пры невялікіх адмоўных тэмпературах. Марозаўстойлівасць лазы ў кожны пэўны перыяд вызначаецца тэмпературай замярзання клетачнага соку. Пры ўтварэнні крышталікаў лёду з клетачнага соку сценкам клеткі наносяцца механічныя пашкоджанні, што прыводзіць да вымярзання надземнай часткі раслін.

Калі тэмпература павялічваецца, у лазе ідуць працэсы пераўтварэння крухмалу ў цукар. Марозаўстойлівасць зніжаецца. Пры раннім укрыцці кустоў поліэтыленавай празрыстай плёнкай у цёплае надвор'е за кошт парніковага эфекту працэсы загартоўкі могуць запавольвацца і нават ісці ў зваротным кірунку. Тое ж самае адбываецца і пры працяглых зімовых адлігах. Калі пасля такой адлігі тэмпература рэзка змяншаецца да мінус 10—15 °С, большасць гатункаў (нават марозаўстойлівых) моцна падмярзае ці цалкам вымярзае! Але хуткасць пераўтварэння вугляводаў у розных гатунках розная. Адны паспяваюць аднавіць ці захаваць крухмал, іншыя — не, што і вызначае зімаўстойлівасць гатунку.

Для стварэння запасаў элементаў мінеральнага сілкавання, якія выкарыстоўваюцца вінаграднай раслінай ранняй вясной, кусты ўгнойваюць. Арганічныя і мінеральныя ўгнаенні пажадана ўносіць на глыбіню размяшчэння асноўнай масы каранёў (50-60 см). З мінеральных угнаенняў увосень уносяць толькі тыя, што ўтрымліваюць фосфар і калій. Такія ўгнаенні трэба ўносіць глыбока. Лёгкараствaральныя азотныя ўгнаенні ўвосень уносіць не варта, паколькі з паліўной вадой, талымі водамі яны вымываюцца і не даюць ніякага эфекту. Іх уносяць увесну. Арганічныя ўгнаенні (кампост, перагной) пажадана ўносіць разам з мінеральнымі — у траншэі, ямы, выкапаныя праз адно міжраддзе, раз у тры гады. Пры такім унясенні на зрэзах каранёў па краі траншэй утвараецца 3-5 новых маладых каранёў. Рост кустоў узмацняецца, ураджайнасць і якасць пладоў паляпшаюцца. У наступныя тры гады ўносяць адзін раз арганічна-мінеральную сумесь у няўгноеныя міжрадді.

# КАЛІ БУЛЬБА СТАЛА ПРАРАСТАЦЬ

**Калі прараслі здаровыя насенныя клубні (парасткі не счарнелі на кончыках, не пакрыліся бурымі плямамі), іх не трэба чапаць да самай вясны, а перад пачаткам прагравання насеннага матэрыялу абламаць, увільгатніць тут жа ў склепе. Калі вакол парасткаў не ўтварыліся карэньчыкі, іх лепш замачыць на 3 гадзіны ў 0,005-працэнтным растворы гетэраўксіну (50 мг на 1 л раствору) і, не дапускаючы рэзкага перападу тэмпературы, высадзіць у цяплічку ці вазончыкі ў памяшканні, якое ацяпляецца. Парасткі закопваюць у зямлю так, каб на паверхні застаўся кончык даўжынёй 1 см. Далікатныя парасткі баяцца яркага сонечнага святла, таму першыя два-тры дні, пакуль парасткі не пазеленеюць, іх варта злёгку прыцяняць. Так вы атрымаеце аздароўленую (з паніжанай канцэнтрацыяй вірyснай інфекцыі) расаду бульбы.**

Вядома, што кожнае абломванне парасткаў памяншае ўраджайнасць клубняў амаль на 20 %. І калі высадзіць усе парасткі не ўяўляецца магчымым, то прарослыя ў склепе клубні, апырскаўшы вадой той жа тэмпературы, што ўсталявалася ў склепе, можна асцярожна перанесці ў светлае памяшканне для далейшага прарошчвання. Там клубні трэба раскласці ў адзін пласт і першы час адзін-два разы ў дзень увільгатняць. Тады парасткі не толькі не засохнуць, але пазеленеюць і нават пачнуць кусціцца. Ніякіх хімічных рэчываў на гэтым этапе ўжываць нельга: парасткі бульбы настолькі далікатныя, што «згараць» у вас на вачах.

Што ж датычыцца харчовай бульбы, якая захоўваецца насыпам, то ў вёсках часам робяць так: абуваюць дзіця 5-7 гадоў у гумовыя боцікі і прапануюць яму «паскакаць» на кучах прарослай бульбы. Парасткі пад вагой дзіцяці абломваюцца, але клубні не траўмуюцца. Гэты прыём больш эфектыўны, чым звычайнае перабіранне. Паўтараць яго, як правіла, не даводзіцца.

А аматарам «нетрадыцыйнай тэрапіі» можна парэкамендаваць такі просты спосаб запаволення прарастання клубняў: над клубнямі раскладваюць кавалкі драцяной спіралі (на бутэльку ад шампанскага накручваюць 10 віткоў міліметровага сталёвага дроту) — па 2-3 спіралі на 1 кв.м. Фізічны эфект уплыву поля, які ўтвараецца спіраллю, дагэтуль не цалкам зразумелы навукоўцам, але факт відавочны: бульба настолькі змяншае сваю здольнасць да прарастання, што на насенныя клубні раскладваць спіралі не рэкамендуецца.

Экзот на гародзе

# УЙСУН

**Уйсун спрадвеку вырошчваецца ў Кітаі (там ён называецца вачу), вельмі папулярны ў Манголіі і на Тайвані. Гэта самая маладая (па часе ўзнікнення) культурная форма латуку. Для яе характэрныя ўсе каштоўныя ўласцівасці салаты: скараспеласць, адносная холадаўстойлівасць, высокая ўраджайнасць. Ад іншых разнавіднасцяў салаты ўйсун адрозніваецца тым, што ў ежу выкарыстоўваецца не толькі лісце, але і сакавітыя буйныя сцёблы. Уйсун назапашвае значна менш нітратаў, чым шматлікія іншыя агародніння і ліставыя культуры.**

Уйсун яшчэ называюць спаржавай салатай. Вышыня расліны — каля метра, ядомая частка мае даўжыню каля 70 см. Мякаць сцёблаў сакавітая, хрумсткая, салатнага колеру, вельмі смачная і карысная. Свежазрэзаныя сцёблы злёгку гаркавыя, аднак неўзабаве пасля падвяльвання смак становіцца саладкаватым, асвяжальным. Лісце ўйсуну можна здымаць тады, калі на кусце з'явіцца 10-15 лістоў — да бутанізацыі. У кулінарыі іх ужываюць у свежым выглядзе, а сцёблы — у смажаным ці салёным. Яны выдатна спалучаюцца з яйкам, цыбуляй, агуркам, радыскай, цукрам, воцатнай заправай. Сцёблы ўйсуну можна засаліць у запас ці захоўваць у маразільнай камеры.



Спаржавая салата — скарбніца вітамінаў, паколькі ў ёй утрымліваюцца карацін, вітаміны С, $B_1$, $B_2$, $B_6$, Е, К, РР, фоліевая кіслата, вітамін Р, які папярэджвае ломкасць крывяносных сасудаў, а таксама больш за 50 мікраэлементаў. Асноўная каштоўнасць уйсуну ў тым, што ён утрымлівае неабходныя для арганізма вугляводы і арганічныя кіслоты. У млечным соку прысутнічае алкалоід лактуцын, які заспакойвае нервовую сістэму, паляпшае сон, стабілізуе крывяны ціск, а таксама спрыяе ўтварэнню антысклератычнага рэчыва — халіну.

Сеяць уйсун можна ў адкрыты грунт з сярэдзіны вясны да канца чэрвеня. Важна, каб глеба была вільготнай. Усходы прараджваюць, пакідаючы парасткі на адлегласці 15-25 см пры шырыні міжрадкоўя у 50 см. Спаржавую салату можна вырошчваць і расадай. Для гэтага ў сярэдзіне сакавіка насенне сеюць пад плёнку, а на сталае месца перасаджваюць праз 4-5 тыдняў.

Догляд уйсуну патрабуецца мінімальны. Досыць адной-дзвюх праполак у маі, рыхленні глебы пасля дажджоў. Падкормліваць яго неабавязкова: гэтая расліна непатрабавальная і засухаўстойлівая. Несумнеўная добрая якасць спаржавай салаты — адсутнасць шкоднікаў і хвароб. А значыць, папершае, няма патрэбы марнаваць на барацьбу з імі грошы і час, а падругое, пасля не даводзіцца, так бы мовіць, спажываць хімікаты, якімі вялі барацьбу.

Зацвітае ўйсун, як правіла, у ліпені—жніўні. Цвіце даволі доўга. Кветкі жаўтлявыя, дробныя, сабраны ў мяцёлкавае верхавіннае суквецце. Насеннікі карычневыя, з чубком, даўжынёй каля 3 мм, у адной «скрыначцы» іх 18-24 шт. Яны здольныя распаўсюджвацца ветрам па тэрыторыі, забяспечваючы салаце самасеў. Збор насення вядзецца выбарачна, паколькі скрыначкі спеюць паступова.

■ За культуру бяседы

# ЯК НА БЕЛАРУСІ ПІВА ПІЛІ...

**На 136-м годзе існавання ААТ «Лідскае піва» вырашыла звярнуцца да піўных традыцый на Беларусі, стварыць летапіс вытворчасці і спажывання пеннага напою — як уласнымі сіламі (з дапамогай архіваў завода і асабістых запісаў дынастый супрацоўнікаў), так і з прыцягненнем найбольш актыўнай часткі насельніцтва краіны. «Лідскае піва» аб'явіла конкурс «Піўны летапіс у цэнтры Еўропы», для удзелу ў якім студэнты ВНУ заклікаены адшукаць і даслаць на суд журы найбольш яркія падзеі і факты айчыннай піўной культуры.**

— Гісторыя нашага завода ўжо закранула тры стагоддзі, — кажа **генеральны дырэктар ААТ «Лідскае піва» Аўдрыус МІКШЫС.** — Мы вырашылі звярнуць увагу шырокай грамадскасці на багатую гістарычную спадчыну Беларусі на прыкладзе тэмы піўной культуры. З аднаго боку, сумесна з гісторыкамі даследуем наша ўласнае мінулае, пішам кнігу аб традыцыях у вытворчасці хмельнага напою на прыкладзе нашага завода. З другога — прапанавалі студэнтам паразмаўляць з бабулямі-дзядулямі, а можа, і наведаць архівы, каб у нас атрымалася як мага больш поўная гісторыя фактаў і лічбаў з жыцця беларусаў...

Работы прымаюцца да канца кастрычніка. Сачыць за развіццём конкурсу можна праз укладку «Гістарычны конкурс» на сайце www.lidskoe.by.

Трэба прызнаць, што звычайнае наша разуменне паняцця выпіўкі, як правіла, звязана з чымсьці адмоўным і выклікае недвухсэнсоўную ўсмешку. Між тым, як ні круці, размова ідзе пра частку народнай культуры. Толькі ў адных краінах яе памятаюць і захоўваюць, а ў некаторых толькі спрабуюць гэта рабіць.

Паводле слоў **дырэктара Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта Барыса ЛАЗУКІ,** на нашай зямлі было шмат цікавых традыцый, звязаных з прыёмам гасцей, уласна гасцяваннем, падачай страў на стол і г.д. Скажам, сам па сабе прыём гасцей быў колькі стагоддзяў таму пытаннем асаблівым. Надзвычай важна было накарміць-напаіць-пакласці спаць, а праз колькі дзён, а тое і тыдняў (бывала, гасцяванне зацягвалася!) — адарыць падарункамі. Заможныя гаспадары дарылі і шаблі, і футры, і нават карэты...

Сталы выстаўляліся класічна — літарай «П» або «Т». Вакол — лавы, якія замяніліся крэсламі толькі ў XVII стагоддзі. Да таго часу лава выконвала спецыфічную функцыю — не выпускаць нікога, пакуль, груба кажучы, гаспадар таго не пажадае. Высокія дзеячы не маглі сабе дазволіць пакінуць прыём, калі для гэтага трэба было падняць не аднаго госця або, тым больш, прыўзняць падол да перастуць цераз лаву. Каб госці не разбегліся раней за намечаны тэрмін, гаспадары маглі нават адзенне схаваць дый вароты замкнуць...

У тым жа XVII стагоддзі з'явіліся папяраднікі афіцыянтаў — людзі, якія падавалі на стол і прымалі брудны посуд. Стравы падаваліся на вялізных агульных талерках, адкуль кожны накладваў на ўласную. Наліваць жа трэба было самому — з невялікіх пасудзін, якія ставіліся на стол. Дарэчы, у іх было што падліваць. І гэта магло быць піва ці штосьці больш моцнае не толькі мясцовага вырабу, але і завезенае адкуль-небудзь. Кажуць, у піўніцы Нясвіжскага замка захоўвалася звыш 30 найменняў адной толькі гарэлкі!

У кожным мястэчку былі не толькі свае мяса-сала-рыба, але і нават свой посуд мясцовых майстроў. З дрэва, керамікі, шкла, металу. Посуд меў свае назвы. Быў, дарэчы, і посуд цікавы — блазнерскі (блізняты, куляўка). Тую ж куляўку немагчыма было паставіць. Як у яе налілі штосьці градуснае — трэба піць. Каб не пакрыўдзіць гаспадара. Ну а калі піць ужо няма сіл, выйсце адно — пацюху плюхнуць на зямлю...

Святлана БАРЫСЕНКА

# БЕЛАРУСКАЯ КАМПАНІЯ «ІКАРТАЙМ» ВЫЙГРАЛА СУД У «НЭСТЛЕ»

**Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь вырашыў адмовіць у іску, які кампанія «Нэстле» прад'яўляла беларускай фірме «Ікартайм». Судовая спрэчка пачалася ў жніўні 2011 года: тады «Нэстле» палічыла, што форма шкляннога слоіка для кавы беларускага прадпрыемства «падобна да ступені змяшэння з таварным знакам», які належыць швейцарскай кампаніі.**

Сцвярджалася, што прымяненне такога слоіка, рэклама і продаж кавы пад брэндамі «Чорнае зерне» і «El café Barcelona» ў шкляных слоіках нібыта парушалі выключныя правы гэтай кампаніі на таварны знак № 643626. Адпаведна, «Нэстле» прасіла суд забараніць беларускаму прадпрыемству прадаваць каву ў такіх слоіках.

Кампанія ж «Ікартайм» за сабой ніякай віны не бачыла і лічыла, што зблытаць два прадукты толькі з-за формы слоіка спажывец не можа, бо ён выбірае каву па брэндзе, цане, якасці і г.д. І пераблытаць каву «Нескафэ» з брэндамі «Чорнае зерне» і «El café Barcelona» складана — для афармлення апошніх, у прыватнасці, прымяняецца нават тэрмаўсадачная ўпакоўка, чаго няма ў іншых брэндаў. Дзмітрый СМАЛЯКОЎ, камерцыйны дырэктар ЗП «Ікартайм», выказаў думку, што сапраўдная прычына падачы іску — гэта праява несумленнай канкурэнцыі на рынку, бо пасля крызісу ў 2011 годзе спажыўцы пераключыліся на больш даступную па цане каву, і кампанія «Ікартайм» са сваімі прадуктамі павялічыла долю на рынку, чым і прыцягнула ўвагу канкурэнтаў. І калі б беларуская кампанія прайграла ў судзе, то давялося б перарабляць упакоўку — а гэта ўжо сур'ёзныя выдаткі, якія маглі б скласці да 100 тысяч еўра.

Тым не менш, ацаніўшы прадстаўленыя суду доказы, судовая калегія прыйшла да высновы, што таварны знак № 643626 і слоікі для кавы «Чорнае зерне» і «El café Barcelona» не ствараюць аднолькавага зрокавага ўражання і не асацыююцца адзін з адным, а значыць, спажывец не можа іх зблытаць.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў кампаніі «Ікартайм», яны, натуральна, рады што Вярхоўны суд прыняў іх бок:

— Вядома, мы задаволены рашэннем суда і лічым яго справядлівым. Працэс быў доўгі і цяжкі, бо «Нэстле» — гэта транснацыянальная карпарацыя з вялізнымі фінансавымі рэсурсамі і вопытам падобных працэсаў у іншых краінах. А наша кампанія, нягледзячы на значны вопыт працы, першы раз аказалася ў такой сітуацыі, — пракаментаваў Дзмітрый Смалякоў і дадаў, што больш «палкі ў колы» пакуль ніхто не ставіць і на беларускім рынку кавы складваецца сумленная канкурэнцыя.

Павел БЕРАСНЕЎ.

## ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

**объявляет о проведении публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОДО «Паркинг», УНП 190149870**

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-700599, расположенное по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 6, пом. 156, площадь — 31,3 кв. м, назначение — помещение неустановленного назначения, наименование — помещение неустановленного назначения, стоимостью 255 943 000 (двести пятьдесят пять миллионов девятьсот сорок три тысячи) белорусских рублей.

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-700596, расположенное по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 6, пом. 153, площадь — 11,6 кв. м, назначение — помещение неустановленного назначения, наименование — помещение неустановленного назначения, стоимостью 94 861 000 (девяносто четыре миллиона восемьсот шестьдесят одна тысяча) белорусских рублей.

